2
Государственная ... Ленина
БИБЛИОТЕКА СССР
им. В. И. Ленина

Нядзеля 20 МАЯ 1945 г.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

№ 6 (530)
Цана 50 кап.

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СНК БССР

Масква. Крэмль.

Іосіфу Вісарыёнавічу СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

З найвялікшай радасцю ўспрыняў беларускі народ вестку аб перамозе слаўных совецкіх армій, кіруемых Вамі ў Вялікай Айчыннай вайне. Разгром гітлераўскай Германіі, поўная і безагаворачная яе капітуляцыя — гэта сусветна гістарычная перамога ўвойдзе ў вякі, як апафеоз вялікай вызваленчай барацьбы совецкага народа і ўрачыстасці нашай справядлівай справы. Гэтая перамога азначае канец разбойніцкім нашэсцям на ўсход нямецкіх мілітарыстаў, якія прыносілі незлічоныя пакуты і беды беларускаму народу. На працягу апошніх трох дзесяцігоддзяў беларускі народ тройчы падвяргаўся разбойніцкім набегам германскіх захопнікаў.

Па Вашаму закліку, дарагі таварыш Сталін, у гэтую Вялікую Айчынную вайну беларускі народ узняўся на свяшчэнную бітву супроць сваіх спрадвечных ворагаў — нямецкіх прыгнятальнікаў. Ні барбарскія разбурэнні гарадоў, ні масавае знішчэнне мірнага насельніцтва, ні выгнанне тысяч людзей у нямецкае рабства не зламалі волю свабодалюбівага беларускага народа. Сотні тысяч беларусоў змагаліся ў радах Чырвонай Арміі і ў партызанскіх атрадах супроць нямецкіх захопнікаў.

Пры брацкай дапамозе ўсіх народаў Совецкага Саюза, дзякуючы намаганням гераічнай Чырвонай Арміі, беларуская зямля была вызвалена ад нямецкіх захопнікаў.

Дарагі таварыш Сталін!

Яшчэ ў пачатку вайны Вы сказалі: «Наша справа справядлівая, перамога будзе за намі!»

Вашы прароцкія словы поўнасцю здзейсніліся. Наша доблесная Чырвоная Армія, кіруемая Вамі, вызваліла ўсю совецкую зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, узняла сцяг перамогі над Берлінам і разам з арміямі нашых саюзнікаў разграміла фашысцкую Германію і прывяла яе да поўнай і безагаворачнай капітуляцыі.

Гэтая перамога азначае ўрачыстасць ленінска-сталінскай ідэалогіі над рэакцыйнай чалавеканенавісніцкай ідэалогіяй фашызма.

Пачаўся мірны перыяд развіцця. На шматлікіх сходах-мітынгах у сёлах, гарадах, калгасах, ва ўстановах, прысвечаных перамозе над германскімі захопнікамі, працавіты беларускі народ дае Вам абяцанне, таварыш Сталін, прыкласці ўсе старанні і сілы, каб у найкарацейшы тэрмін залячыць раны, нанесеныя гаспадарцы і культуры, з чэсцю выканаць задачы мірнага будаўніцтва.

Дзякуючы выдатным перамогам Чырвонай Арміі і дапамозе ўсіх народаў Совецкага Саюза, Совецкая Беларусь вызвалена, аднаўлена як дзяржава і заняла вартае месца сярод свабодалюбівых народаў свету. Совецкая Беларусь разам з другімі нацыямі заклікана вырашаць складаны шыя пытанні міру і бяспекі.

У дні Вялікай Перамогі мы прыносім Вам, другу і правадыру і настаўніку, нашы віншаванні і пачуццё гарачай удзячнасці ад імя беларускага народа.

Няхай жыве наша Перамога!

Няхай жыве наша магутная Совецкая Радзіма!

Няхай жыве пабеданосная Чырвоная Армія!

Няхай жыве наш таварыш Сталін!

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР — Н. НАТАЛЕВІЧ.

Старшыня Совета Народных Камісараў Беларускай ССР — П. ПАНАМАРЭНКА.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі — Н. КІСЯЛЕЎ.

За работу, таварышы!

Яшчэ гучыць у нашых вушах рэха трыццаці артылерыйскіх залпаў з тысячы гармат, якія абвясцілі ўсяму свабодалюбіваму свету аб наступленні пераможнага канца Вялікай Айчыннай вайны супроць нямецкіх захопнікаў. Яшчэ ў нашых вачах свецяцца ўсімі колерамі вясёлкі цудоўныя ракеты салюта, якія адзначылі наступленне доўгачаканага міру ў Еўропе. І хоць нашыя сэрцы так моцна яшчэ хвалююцца ад перажытай радасці, але вітаючы адзін аднаго «З перамогай!», трэба нам аднак неадкладна брацца за тую працу, якая вынікае з сталінскага сцвярджэння, што «пачаўся перыяд мірнага развіцця».

У сваім гістарычным звароце да народа ў дзень перамогі таварыш Сталін сказаў: «Вялікія афіры, прынесеныя намі ў імя свабоды і незалежнасці нашай Радзімы, незлічоныя нястачы і пакуты, перажытыя нашым народам у ходзе вайны, напружаная праца ў тылу і на фронце, адданая на алтар айчыны, не прайшлі даремна і ўвянчаліся поўнай перамогай над ворагам».

Цяпер, пераходзячы да перыяда мірнага развіцця, напружаная праца ўсяго совецкага народа, які паказаў цуды ў часе вайны, павінна быць цалкам накіравана на ўзмацненне магутнасці нашай радзімы, на хутчэйшую адбудову гарадоў і вёсак, фабрык і культурных устаноў, разбураных і знішчаных нямецкімі захопнікамі.

Перад намі паўстае задача асваення і асэнсавання таго багатага вопыту самаахвярнай працы і творчасці нашага народа ў часе вайны, каб у мірных умовах яшчэ з большай сілай рухаць наперад нашу соцыялістычную гаспадарку.

У гэтым асваенні і асэнсаванні вопыта ўчарашняга дня вайны значную ролю адыгралі і работнікі літаратуры і мастацтва.

З першага дня вайны нашы пісьменнікі і мастакі, кампазітары і артысты дзейна ўключыліся ў барацьбу супроць нямецкіх захопнікаў. Вялікія бітвы доблесных нашых воінаў заўсёды суправаджала баявая песня, палымяны верш, гарачае слова, якія падбадзёрвалі, клікалі да канчатковай перамогі над фашысцкім зверам.

Нашы пісьменнікі і мастакі тварылі часам «на ходу», часам на перадавой лініі фронта і гэтым яны паказалі на справе, што для іх не існуе «закон», які сцвярджаў, што «калі гарматы гавораць — муза маўчыць». Гарматы найнавейшых канструкцый нашых вынаходцаў гаварылі поўным голасам і поўным сваім голасам гаварыла совецкае баявое мастацтва. Беларуская літаратура і мастацтва іграли велізарнейшую ролю ў справе разгортвання шырокага руху народных мсціўцаў у варожым тылу.

Цяпер, калі замест гулу гармат усё галасней чуваць песня працы, перад літаратурай і мастацтвам паўстаюць задачы велізарнейшага значэння. Чым больш мы аддаляемся ад франтавых дзён, тым відавочней становіцца ўся веліч справы, якую здзейсніў совецкі народ, людзі сталінскай эпохі. Паказаць вобраз нашых людзей, мастацкімі сродкамі раскрыць тыя крыніцы, адкуль яны чэрпалі сілы для выратавання чалавечай культуры, паказаць вялікі гуманізм вызваліцеляў прыгнечаных народаў і зацятую бязлітаснасць змагароў супроць фашысцкіх прыгнятальнікаў — вось неадкладная задача, якая павінна быць вырашана нашымі работнікамі на фронце літаратуры і мастацтва. Вырашэнне гэтай задачы, глыбіня і ўсебаковасць мастацкага абагульнення пройдзенага этапа ў вялікай меры дапамогуць далейшаму ўздыму гаспадаркі і культуры нашай краіны.

Куды толькі прышоў совецкі чалавек, ён разам са сваёй дасканалай зброяй прынёс таксама і совецкую культуру. Нічога дзіўнага, што зацікаўленасць нашай літаратурай і мастацтвам ва ўсім свеце і ў першую чаргу—у славянскіх краінах незвычайна вырасла. Творчасць беларускіх пісьменнікаў і паэтаў цяпер вядома ў Польшчы, Югаславіі, Балгарыі, Чэхаславакіі. Народныя масы Польшчы чулі і палюбілі беларускія народныя песні, прадстаўнікі ўрада Польскай Рэспублікі ў часе іх апошняга візіта ў Мінск вельмі высока ацанілі майстэрства артыстаў Беларускага тэатра оперы і балета. Штучныя межы, якія ў мінулым адгароджвалі культуру братніх славянскіх народаў, больш не існуюць. Тым большая адказнасць ляжыць цяпер на творцах нашай літаратуры і мастацтва, каб іх творы сапраўды глыбока адлюстравалі гераічную эпапею народа-змагара. Вырастае адказнасць літаратара і мастака за кожны іх твор. Не могуць быць цярпімы ў крытыцы ўсякія «скідкі» для няспелых і недароблены твораў. Гэта можа толькі шкодзіць росту нашага мастацтва.

Наступіўшы перыяд мірнага развіцця патрабуе ад кожнага пісьменніка і мастака, каб яго непасрэдная сувязь з народнымі масамі была як найбольш моцная. Замкнёнасць у сваім творчым габінеце была-б найбольш шкоднай як для самога творцы, так і для яго твораў.

Народныя масы, якія пад нямецкай акупацыяй не мелі магчымасці знаёміцца з творамі совецкай літаратуры і мастацтва, вельмі цягнуцца цяпер да жывога слова, хочуць слухаць мастацкі спеў, бачыць карціну таленавітага мастака. Праведзены нядаўна Усебеларускі агляд мастацкай самадзейнасці паказаў, якое велізарнае імкненне народ народных мас да ўсіх формаў і жанраў мастацтва. На вясковай сцэне пачынаюць ставіць п'есы з рэпертуара прафесіянальных тэатраў. Гэта з'явішча вялікага культурнага значэння. Задачай творцаў совецкага мастацтва з'яўляецца: усімі сіламі дапамагчы культурнаму росту народных мас, непасрэдна сустракацца з нашым чытачом і гледачом, каб дакладна ведаць яго запатрабаванні. У гэтай справе вялікую ролю павінны адыграць Саюзы совецкіх пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, архітэктараў, якія ніяк не могуць абмяжоўвацца толькі чыста прафесіянальнымі справамі. Яны павінны стаць арганізатарамі ў справе дапамогі народным масам у іх культурным росце.

Работнікі літаратуры і мастацтва ўступаюць у перыяд мірнага развіцця загартаванымі ў цяжкім змаганні за лёс нашай краіны, нашага народа і яго культуры. Іх вялікі баявы і культурна-творчы вопыт часоў вайны павінен быць як найшырэй выкарыстан ў часе мірнага развіцця. За салютам перамогі на фронтах вайны прыдуць новыя салюты ў чэсць перамог на фронтах гаспадарчай і культурнай адбудовы.

Справа чэсці і гонару работнікаў літаратуры і мастацтва — усе свае сілы, увесь свой талент аддаць нашаму народу, які вызваліў чалавецтва ад фашысцкай цемры.

Нанава адбудаваны помнік Ул. І. Леніну ля Дома Ураду ў г. Мінску

ВЫЙШАЎ ПЕРШЫ НУМАР ЧАСОПІСА „БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ“

Пасля чатырохгадовага перапынку выйшаў з друку першы нумар тэарэтычнага і палітычнага часопіса „Большэвік Беларусі» — орган ЦК КП(б)Б.

У нумары змешчаны ўсе важнейшыя палітычныя дакументы, адлюстроўваючыя апошнія падзеі на франтах Айчыннай вайны і ў нашай краіне. У ім апублікаваны матэрыялы, прысвечаныя VI пленуму ЦК КП(б) Беларусі, пастанова пленума па дакладу Сакратара ЦК КП(б)Б тав. П. К. Панамарэнка «Аб задачах партыйных арганізацый Беларусі па аднаўленню народнай гаспадаркі і ліквідацыі вынікаў нямецкай акупацыі».

У часопісу змешчаны Першамайскі загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна, акт аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі, зварот таварыша І. В. Сталіна да народа і іншыя. Затым надрукаван артыкул Сакратара ЦК КП(б)Б тав. Кісялёва «Баявыя задачы партыйных арганізацый Беларусі ў аднаўленні сельскай гаспадаркі рэспублікі».

У канцы часопіса адкрыт спецыяльны раздзел «З гісторыі нашай Радзімы», у якім змешчан навуковы артыкул Ф. Канстанцінава, аб старажытнай культуры чалавецтва на тэрыторыі Беларусі і даведачны матэрыял аб беларускіх дзяржаўных архівах.

У склад рэдкалегіі часопіса ўвайшлі т. т. Гарбуноў, Малін, Ільюшын, Горын, Краўчанка, Закурдаеў.

(БЕЛТА).

Вышаў з друку першы нумар часопіса „Полымя“

Гэтымі днямі вышаў з друку першы нумар штомесячнага літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя» — органа Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

У нумары надрукавана паэма «Адплата» Якуба Коласа, апавяданне «Талісман» Усевалада Краўчанкі, вершы Максіма Танка, п'еса «Заложнікі» Алеся Кучара, нарыс «Герой Совецкага Саюза Барыс Царыкаў» Хім Муратава, артыкул «Славянскія плямёны — продкі беларускага народа» Ф. Канстанцінава, артыкул «Апавяданні жыццёвай праўды» Міхася Святланіна, артыкул «Вялікі геній» А. Нявады і артыкул «Іван Андрэевіч Крылоў» Міхася Ларчанкі.

У нумары змешчана таксама багатая хроніка.

У склад рэдкалегіі часопіса ўваходзяць Пятрусь Броўка, (адказны рэдактар), Пятро Глебка, Міхась Лынькоў, Кандрат Крапіва, Якуб Колас і Максім Танк.

Часопіс для піянераў і школьнікаў „Бярозка“

Пад рэдакцыяй пісьменніка Алеся Якімовіча пачне ў бліжэйшы час выходзіць штомесячны часопіс для піянераў і школьнікаў «Бярозка». У першым нумары, які выйдзе ў чэрвені месяцы, будзе змешчан багаты матэрыял, прысвечаны гістарычнай перамозе над нямецкімі захопнікамі. У нумары будуць надрукаваны апавяданні А. Якімовіча, Янкі Брыля, М. Клімковіча і М. Хрысціча і вершы Янкі Купалы, П. Броўкі, В. Таўлая, В. Віткі, К. Кірэенкі і А. Астрэйкі. Апрача мастацкага матэрыяла, будуць надрукаваны навуковыя артыкулы. Да першага нумара будзе дадан асобна надрукаваны «Гімн Совецкага Саюза», афармлены мастаком Тычынам.

Новыя кнігі для дзяцей і моладзі

Амаль тры гады нашы дзеці былі пазбаўлены лепшага свайго сябра — кнігі. З агідай наша моладзь адкінула ад сябе тую «літаратурную» атруту, якую падсоўвалі ёй нямецка-беларускія фашысты.

За кароткі час сектар дзіцячай і маладзёжнай літаратуры Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі падрыхтаваў і здаў у друк наступныя кнігі: «Арляняты» Янкі Купалы, «Рак-вусач» (казка для дзяцей) Якуба Коласа, «Дзед-Мароз» А. Бялевіча. На беларускую мову перакладзены: «Муму» Тургенева (пераклад А. Якімовіча), «Сігнал» В. Гаршына (пераклаў М. Клімковіч) і «Гаўрош» В. Гюго.

Рыхтуюцца да друку: «Казка пра мядзведзя» Максіма Танка, «Вераб'ёвыя госці» і «Нашы прыяцелі» (для дашкольнікаў) А. Якімовіча, «Сын вады» Я. Маўра, «Дзед і жораў» і «Цудоўная дудка» В. Вольскага, «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі. З рускай мовы перакладзены «Апавяданні для дзяцей» Л. Н. Талстога, «Апавяданні для дзяцей» А. П. Чэхава, «казкі» А. С. Пушкіна, «Вершы для дзяцей» Ул. Маякоўскага, «Цімур і яго камандa» А. Гайдара.

Канцэрты Мінскай самадзейнасці

Мінскі Абласны Дом народнай творчасці праводзіць вялікую канцэртную работу. Спачатку года сіламі мастацкай самадзейнасці наладжана 126 канцэртаў. Выступленні танцораў, спевакоў, музыкаў, выканаўцаў мастацкага чытання з поспехам праходзяць у вайсковых часцях, шпіталях, у калгасах, на прадпрыемствах.

У канцэртах прымаюць удзел лепшыя калектывы самадзейнасці г. Мінска — Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, Медінстытута і мэблевай фабрыкі. З асобных выканаўцаў найбольшым поспехам карыстаюцца танцоры Ракітніцкія і Левін, выканаўца прыпевак Гурына (г. Заслаўль), ілюзіяніст Саўкін.

Студыя мастакоў-самавучак

Пры Мінскім Абласным Доме народнай творчасці арганізавана студыя для навучання мастакоў-самавучак. Аматары выяўленчага мастацтва будуць вучыцца без адрыву ад вытворчасці, у вольныя ад працы часы.

Першыя заняткі па азнаямленню з працамі студыйцаў правёў мастак А. Волкаў.

Самавучкі актыўна ўключыліся ў падрыхтоўчую работу да Усесаюзнай мастацкай выстаўкі «Перамога». Яны пішуць малюнкі і карціны на розныя тэмы — Вялікая Айчынная вайна, аднаўленчая праца, героі-партызаны і г. д.

ПРА НЕКАТОРЫЯ ХІБЫ НАШАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Наша літаратура — літаратура народа. Яна поўніцца сокамі жыцця, у ёй дыханне сучаснасці. У розных перыядах яна нязменна выражала думы народа, яго радасць і гора.

У перыяд рэканструкцыі народнай гаспадаркі мастацкае слова клікала працоўных у падземныя тунэлі і шахты, узнімала іх на рыштаванні будоўляў, абуджала дух калектывізма.

Быў час мірнага калгаснага жыцця, час росквіту і хараства. У нашай літаратуры паявіліся новыя матывы. У ціхіх лірычных і задушэўных напевах паэты і пісьменнікі славілі росквіт электрычных зарніц, рокат трактарных матораў, апявалі калгасныя вечарынкі, каруселі, сінявокія ільны, пералівы паспеўшых жытоў.

З пачаткам вайны скончыліся гэтыя мірныя настроі нашай літаратуры.

Нямецкія танкі змалацілі жыта. Чужыя коні здратавалі зялёны луг. Вогненныя слупы ўзняліся ў неба — запалалі гарады і вёскі. Пачалася Вялікая Айчынная вайна.

У першых радах барацьбітоў супроць фашысцкіх захопнікаў выступілі нашы пісьменнікі. Зусім новыя, суровыя і гнеўныя матывы загучэлі ў літаратуры. Янка Купала ў сваёй паэзіі даў грозны наказ партызанам бязлітасна знішчаць ворага.

У чым сіла вядомых купалаўскіх радкоў з верша «Беларускім партызанам»? У тым, што яны проста, але з вялікім пафасам, выражаюць волю народа да барацьбы. Купала добра разумеў, што сіла паэзіі не ў штукарстве, не ў квяцістасці. Сіла паэзіі — у народнай прастаце, у выражэнні тых думак, якімі жыве народ.

«Паэт... грамадзянін сваёй зямлі, сын свайго часу, — пісаў Бялінскі. — Дух народа і часу на яго не могуць дзейнічаць менш, чым на другіх».

Разуменне душы народа, пачуццё часу — асноўнае для пісьменніка. Гэтым шляхам ідуць лепшыя прадстаўнікі беларускай совецкай літаратуры і ён прывёў іх да выдатных творчых поспехаў у дні Айчыннай вайны. Але іменна вялікія поспехі нашай літаратуры дазваляюць ставіць перад пісьменнікамі больш глыбокія задачы і даюць права рашуча выступіць супроць рэштак таннай патэтыкі, бескультурнасці, імкнення працаваць па гатовых стандартах, якое ёсць у некаторых нашых літаратараў, што не растуць, а топчуцца на адным месцы.

Небяспека залежнасці ад ужо створаных літаратурных узораў — адна з вялікіх небяспек нашай літаратуры, асабліва паэзіі. Гэта небяспека награжае не толькі маладым пісьменнікам, але і больш сталым.

Вельмі нялёгка, абраўшы сабе пэўную тэму, знайсці для яе новыя формы ўвасаблення, тым больш, што пад рукою заўсёды знойдзецца гатовы ўзор, створаны другім, можа нават больш сталым, пісьменнікам.

Вось, напрыклад, трэба адлюстраваць у вершы мужнасць нашага чалавека. І ўжо ўсё зразумела. Узор ёсць: «...ён ішоў і падаў, тройчы ўздымаўся, смяротна прабіты куляй...» Гэта быў у свой час не кепскі вобраз. Але цяпер ён перайшоў ужо ў стандарт, ён не ўздзейнічае больш на нас. А вось прыклад лёгкадумнага вырашэння лірычнай тэмы вайны: «Яны стаялі каля тына, яна трымала за павады баявога каня, а ён абяцаў ёй...» Ці можа быць і другі варыянт: «... ён просіць: кахай і чакай мяне... я табе не здраджу ніколі...»

Тут узяты, вядома, не цытаты, гэта толькі пераказ думкі многіх вершаў. Але гэта ёсць стандарт, прычым стандарт, які ўжываецца залішне часта.

А вось узор народна-сентыментальнага верша: «...Ой, з-за лесу, ды з-за бору...»

Ужо ўсім маладым паэтам вядома, што для выражэння суму па каханым, гераіня павінна хадзіць паміж дрэў і кветак, а ён мусіць не расставацца з фота сваёй каханай...

Трэба сказаць, што фальклор таксама не з'яўляецца універсальным ратункам пры вырашэнні лірычных тэм паэзіі. Вельмі кепска, калі пра твор можна адразу сказаць: «А, зразумела! Гэты верш напісаны ў народным плане!» Гэта азначае толькі, што ён з'яўляецца стылізацыяй, далёкай ад мастацтва. Фальклорны элемент павінен быць настолькі арганічным, каб нельга было адрозніць, дзе пачынаецца фальклор і дзе канчаецца аўтар. Не цытатны фальклор патрэбен («а ёсць яшчэ байка такая»), а арганічна ўбіраць патрэбныя элементы народнай творчасці.

Ёсць і другая крайнасць у паэзіі. Гэта творы напышлівыя, узнёслыя, так званага «пафаснага» складу. Усё ў іх перавялічана і лепш за ўсё іх характарызуе азначэнне літаратурнай надзьмутасці. Змест іх вельмі нязначны, а то і зусім адсутнічае, адсутнасць яго прыкрываецца ўяўнай значнасцю і ўзнёсласцю. Вобразы ў гэтых вершах эфектныя, падкрэсленыя. У такіх творах вы абавязкова знойдзеце дзікія некранутыя нетры прыроды, ласёў і ваўкоў, якія, як шалёныя, імчацца праз гэтыя нетры.

Можа адмаўленне такога роду паэзіі вядзе да адмаўлення ўзнёслага, рамантычнага, незвычайнага? Не! Гэта не ёсць адмаўленне рамантыкі. Рамантыка сама патрабуе не адпрацаваных, надзьмутых уяўным пафасам дэталяў, а жывога канкрэтнага вобразу, новага і непаўторнага.

Надзвычай адмоўна адбіваецца на нашай паэзіі яе рытмічная беднасць. Звычайнае чатырохрадкоўе, з крыжаванай рыфмай, не аздобленае смелай метафарай ці параўнаннем, стварае ўражанне гладкапісу.

Многія вершы настолькі прылізаныя, гладкія, што няма зроку на чым «спатыкнуцца», затрымацца. Так чытач безуважна і праходзіць міма гэтага гладкапісу.

Няўжо вялікая наватарская рэбота Маякоўскага прайшла даремна для гэтых паэтаў? Мы зусім не заклікаем пісаць па рытмічных узорах Маякоўскага. Гэта была-б найгоршай абразай для яго памяці. Традыцыі Маякоўскага патрабуюць усё новых і новых форм.

Праўда, у беларускай паэзіі перыяда вайны ёсць спробы, і даволі цікавыя, рытмічнага ўзбагачэння вершу, грунтуючыся на складзе народнай паэзіі. Але, на жаль, пакрысе гэта ўжо таксама становіцца ўзорам, абавязковым для паэтаў. Добрую знаходку пачалі эксплуатаваць залішне часта.

Пошукі новага не ёсць заклік да штукарства. Маякоўскі лепш за другіх паэтаў паказаў, што няма розніцы паміж узвышаным і штодзённым, паміж агіткай і паэзіяй. Звычайны газетны лозунг, аратарскі заклік, рытмічна своеасабліва выражаны, замацаваны смелай рыфмай, станавіўся ў Маякоўскага паэзіяй.

Тое самае трэба сказаць пра вобразы паэзіі, якія мы прывялі ў якасці ўзораў стандартнасці. Павернутыя нейкай новай гранню, асветленыя яркай рыфмай, у новым рытмічным ладзе яны могуць гучэць нова і арыгінальна.

Часта ў нас паэмы з дакладна распрацаванымі героямі, з прычыны іх рытмічнай беднасці, адсутнасці смелай метафары, узлёту паэтычнай думкі, нагадваюць вершаваныя газетныя нарысы. Тут мы сустракаемся з праблемай спецыфічнасці паэзіі — паэзія павінна вырашаць своеасаблівыя паэтычныя тэмы, а не станавіцца дадаткам да прозы.

Сакрэт сапраўднай паэзіі ў ператварэнні звычайнага ў паэтычнае. Лепшым узорам можа тут служыць Янка Купала. Возьмем яго цудоўную паэму «Яна і я». Аб чым там гаворыцца? Аб звычайных працэсах працы. Як ткуць, потым беляць палатно, як выганяюць жывёлу ў поле і г. д. Але гэтыя звычайныя працэсы працы так апаэтызаваны, што, здаецца, няма на свеце нічога больш узвышанага і чыстага, чым гэтыя працэсы працы. І палатно з кроснаў рассцілаецца, як прасторная дарога да нязведанага шчасця... Гэта і ёсць паэзія!

Успомнім другі прыклад. Дзядзька Антось у «Новай зямлі» Якуба Коласа выбірае сабе на рынку касу. Ён прабуе яе і гэтак і так — ставіць на нос і на пятку, і нарэшце вешае на шост і крычыць ёй здалёк: «каса!» Калі адгукнецца, значыць — добрая. Вось дзе сапраўдная паэзія працы! З якім замілаваннем напісана гэта карціна, быццам нічога больш важнага на свеце і няма, як выбар гэтай касы. Так бывае, калі паэт не абыякавы да свае тэмы, калі ім валодае адзін імпэт, адно пачуццё, якое Бялінскі назваў пафасам паэзіі. Гэтым вялікім паэтычным пафасам сагрэты і лепшыя творы маладзейшых беларускіх совецкіх пісьменнікаў перыяда Айчыннай вайны.

А як гэта важна — уменне ператвараць звычайнае, штодзённае, у незвычайнае і ўзвышанае для мастацкай прозы. Гэтым сакрэтам у вялікай ступені валодаў Кузьма Чорны.

У некаторых нашых празаікаў лёгкадумны падыход да рэчаіснасці. Яны абмяжоўваюць сябе з'явамі, што ляжаць на паверхні, ці карыстаюцца ўжо аджытымі літаратурнымі трафарэтамі.

Тут можна назваць некалькі такіх трафарэтаў, якія паўтараюцца часта: дзядуня-мсцівец, ціхі пчаляр, які становіцца барацьбітом, малады хлопец, які помсціць за каханую... і г. д.

Ці-ж усяго гэтага не было ў жыцці?—запытаецца чытач.

Так, было! Але задача пісьменніка ў тым і заключаецца, каб паказаць гэтыя вобразы своеасабліва, непаўторна, непадобна да таго, як яны былі паказаны другімі пісьменнікамі. Толькі тады гэтыя вобразы стануць здабыткам мастацтва.

Шмат у чым стрымлівае развіццё нашай прозы арнаментальнасць, падробка пад народны стыль, якія, ігнаруючы спецыфічнасць прозы, ператвараюць яе ў дадатак да паэзіі.

Вось далёка не поўны пералік хібаў, якія ў большай ці меншай ступені характэрны для некаторых нашых пісьменнікаў.

Пераадоленне гэтых хібаў узніме нашу літаратуру на больш высокую ступень мастацкай спеласці.

А. ГАНЧАРЫК.

Старажытная беларуская архітэктура

У дзесятым стагоддзі ў жыцці ўсходніх славянаў адбыліся вялікія змены. Разрозненыя да таго часу славянскія плямёны крывічоў, палян, дрыгвічоў і севяран аб'ядналіся і ўтварылі Кіеўскае княства, якое з першых дзён існавання ператварылася ў адну з мацнейшых дзяржаў Еўропы. Узмацненне палітычных і культурных сувязей рускага народа з Візанціяй, як спадчынай антычнасці і краінай самай высокай культуры таго часу, дапамагло рускаму народу за кароткі тэрмін стварыць у сябе каменную архітэктуру, жывапіс і літаратуру, глыбокія па свайму зместу і высокамастацкія па выкананню.

Асобныя помнікі рускай культуры, створаныя ў той час, амаль тысячу год назад, захаваліся да нашых дзён. Да іх адносяцца перш за ўсё Кіеўская, Полацкая і Ноўгарадская Сафіі, пабудаваныя ў XI стагоддзі.

САФІЯ І СПАСКАЯ ЦАРКВА Ў ПОЛАЦКУ

Полацкая Сафія, таксама як і яе равесніцы, сведчыць аб тым, што рускі і беларускі народы, ужо на раннім этапе зараджэння сваёй дзяржаўнасці стварылі выдатныя творы сусветнага зодчества. Гэтыя збудаванні з'яўляюцца піонерамі рускай культуры. Іх значэнне вялікае яшчэ і таму, што яны на некалькі стагоддзяў вызначылі кірунак у развіцці архітэктуры. Іменна іх планы, знадворны выгляд і арганізацыя ўнутранай прасторы з'яўляліся ўзорам для збудавання многіх помнікаў рускага і беларускага зодчества ў наступныя стагоддзі.

План Полацкай Сафіі XI ст. квадратовы. Ён заканчваецца трыма кантаванымі абсідамі з усходу і трыма такімі-ж з захаду. Унутры храм быў падзелен шаснаццаццю слупамі на пяць нэфаў. Сцены Сафіі былі падзелены масіўнымі пілястрамі, у прамежках паміж якімі высокія, але вузкія вокны. Паводле сведчання рускага Васкрасенскага летапіса Полацкая Сафія мела сем галоў.

Ужо з гэтага кароткага апісання відаць, якім грандыёзным і вялікасным збудаваннем была Сафія.

Помнікі такога тыпу будаваліся ў той час у паўднёва-славянскіх краінах, у Візанціі, Грузіі і Арменіі. Сярод гэтых помнікаў, акрамя Кіеўскай і Ноўгарадскай Сафіі, найбольш блізка да Полацкай Сафіі стаіць храм Моквы на Каўказе, пабудаваны ў XI стагоддзі. Факт гэты цікавы тым, што ён гаворыць аб блізкай сувязі культуры рускага народа таго часу з культурай Грузіі, Арменіі, а таксама з культурай паўднёва-славянскіх краін: Балгарыі, Сербіі, Македоніі і Славакіі.

Унутры Полацкая Сафія была размалявана манументальным насценным жывапісам. Пазней яна была пакрыта пластам вапны. І толькі незадоўга да вайны беларускія вучоныя адкрылі асобныя жывапісныя фрагменты храма.

У старажытнасці Сафія мела вялікае культурнае значэнне. У ёй была багатая бібліятэка, якая складалася з славянскіх, грэчаскіх і лацінскіх кніг. Пры ёй існавалі школы для навучання пісьменнасці, дзе пісаліся і кнігі.

Лёс Полацкай Сафіі нагадвае сабой лёс беларускай культуры. На працягу свайго існавання яна некалькі разоў гарэла, разбуралася і аднаўлялася зноў у яе ранейшай велічы.

Пабудавана Сафія ў Полацкім крэмлі. Раней тут быў цэнтр горада, дзе жылі князі, адбываліся народныя сходы, веча, вырашаліся дзяржаўныя пытанні.

Другім цікавым помнікам горада Полацка з'яўляецца Спаская царква, збудаваная каля 1161 года беларускім архітэктарам Іаанам. Як гэта відаць з «Жыція Ефрасінні Полацкай», Іаан умеў рабіць добрую цэглу і быў майстрам высокай кваліфікацыі. Акрамя гэтага храма, ім было створана яшчэ некалькі пабудоў. Полацк быў адным з багатых і культурных гарадоў Рускай зямлі. У ім у той час жылі і працавалі Ефрасіння Полацкая, беларускі майстар Богша, які стварыў вядомы Крыж Ефрасінні.

У гісторыі рускай, беларускай і ўкраінскай архітэктуры Спаская царква мае вялікае значэнне. У архітэктуры гэтых брацкіх народаў у працэсе гістарычнага развіцця склалася два тыпы архітэктурных збудаванняў. Да першага тыпа адносяцца храмы, якія маюць у аснове кубічны корпус, завершаны пяццю ці адной главой. Прыкладам такіх збудаванняў з'яўляецца Ноўгарадская Сафія, Успенскія саборы ў Маскоўскім крэмлі і ў Владзіміры. Да другога тыпу адносяцца храмы пірамідальна-шатровай формы, як храмы Вазнясення ў Каломенскім пад Масквой і Васілія Блажэннага на Чырвоным Пляцы. Як лічуць гісторыкі рускай архітэктуры праф. Н. Брунаў і праф. Н. Вароній, Спаская царква ў Полацку з'яўляецца першым з захаваўшыхся храмаў, у якім выразна адзначаны рысы пірамідальна-шатровага, вежавага

Храм Сафіі ў Полацку.

тыпу рускага, беларускага і ўкраінскага зодчества.

Такім чынам архітэктар Іаан з'яўляецца адным з піонераў у справе стварэння нацыянальнага зодчества (пірамідальна-шатровага тыпу) Расіі, Беларусі і Украіны.

Чым-жа адрозніваецца збудаванне архітэктара Іаана ад другіх пабудоў таго часу?

План храма прадаўгаваты і заканчваецца з усходу паўкруглай абсідай. Унутры ён падзелены на тры нэфы так, што сярэдні з іх значна шырэйшы за бакавыя. Найбольш умястоўнай часткай храма з'яўляецца падкупалавы квадрат. Ужо гэтым ён нагадвае сабой вежы цытадэляў і пірамідальна-шатровыя храмы рускага зодчества XVI ст.

У вонкавай кампазіцыі храма, як ён выглядаў у XII ст., была выражана пірамідальнасць. Першым ярусам гэтай кампазіцыі былі прытвор з захаду і абсіда з усходу. Наступны ярус гэтай пірамідальнай кампазіцыі складаў асноўны кубічны корпус, на якім знаходзіўся барабан з главой на чатырохкантовым пастаменце, апрацаваны трохлопастнымі аркамі.

Параўноўваючы кампазіцыю Спаскага храма з рускай архітэктурай XVI—XVII ст. ст., мы бачым, што архітэктар Іаан, які стварыў гэты храм за некалькі тагоддзяў раней, прадугадаў шлях развіцця нашай архітэктуры.

У старажытнасці храм быў размалёваны фрэскавым жывапісам. Пазней зуіты замазалі гэты жывапіс вапнай і азмалявалі храм па свайму густу. Да айны асобныя фрагменты гэтага цудоўнага жывапісу былі ачышчаны ад атынуўкі, але большасць яго і да гэтага часу схавана пад пластам вапны. Жывапіс, як і сам храм, мае першаступеннае значэнне для вывучэння гісторыі рускага, беларускага і ўкраінскага мастацтва.

БЛАГАВЕШЧАНСКІ ХРАМ У ВІЦЕБСКУ

У Віцебску да пачатку Айчыннай вайны яшчэ быў захаваны цікавы храм, пабудаваны ў X ст. кіеўскай княгіняй Вольгай. У асноўных сваіх рысах ён блізкі да Спаскай царквы Полацка. План гэтага храма, як і план Полацкай Сафіі, мае многа агульнага з грузінскай і армянскай архітэктурай, што гаворыць аб даволі цесных сувязях у даўнія часы Беларусі з сяброўскімі нам каўказскімі народамі.

Значную цікавасць для нас мае муроўка храма. Муроўка складаецца з пескавых каменных блокаў, вышэй якіх ідуць два рады тонкай плітняковай цэглы, звязаныя вапнавым растворам. Такая муроўка з'яўляецца рэдкай з'явай у старажытна-рускай архітэктуры і сведчыць аб высокай будаўнічай тэхніцы нашых продкаў.

Унутры храм быў размалёваны цудоўным фрэскавым насценным жывапісам.

Вялікай стратай для сусветнага мастацтва з'яўляецца знішчэнне немцамі гэтага жывапісу. У 1941 г. фашысцкія барбары спалілі храм. Увесь жывапіс храма выгарэў. Толькі на адным з усходніх слупоў захавалася цікавая жывапісная кампазіцыя, выкананая яркімі і ў той-жа час гарманічнымі зялёнымі, блакітнымі і жоўтымі колерамі. У 1944 г. нямецкія войскі ператварылі руіны храма ў агнявы пункт. Уся пляцоўка вакол храма была пакапана акопамі і ходамі. У сценах храма прабіты амбразуры для стральбы.

СТАРАЖЫТНАСЦІ ГРОДНІ

Гродня, як і Полацк, у даўнія часы была адным з культурнейшых гарадоў Беларусі. Гэта відаць з таго, што на адной замкавай гары ў Гродні да гэтага часу захаваліся рэшткі трох каменных архітэктурных збудаванняў X—XIII ст. ст. і некалькі драўляных, а ў мясцовасці, што прылягае да замка, захавалася вядомая Каложаская царква.

Храм X—XI ст. ст. на Замкавай гары і Каложаская царква аднатыповыя па сваіх планах з храмам Полацкай, Кіеўскай, Чарнігаўскай і Владзімір-Суздальскай архітэктуры XI—XII ст. ст. Гэта, побач з другімі помнікамі гродненскай старажытнай культуры, адкрытых у Гродні, гаворыць аб адзіным шляху развіцця культуры старажытнарускіх гарадоў.

Не меншую цікавасць мае для нас княжаскі церам (палац), выяўлены на Замкавай гары ў Гродні. Значная яго частка абвалілася ў Нёман. Пабудову церама вучоныя адносяць да XII—XIII ст. ст., іменна да таго часу, калі г. Гродня быў сталіцай удзельнага рускага княства.

Храм і церам пабудаваны з лякальнай цэглы, якая мае рознастайныя форму і памер. У асобных месцах у сцены храма і церама ўмураваны шліфаваныя гранітныя каменні. Акрамя таго, сцены храма былі ўпрыгожаны глазураванымі плітамі, якія ўтвараюць розныя арнаментавыя матывы. Унутры-ж храм меў галаснікі (замураваныя ў сцены гліняныя пасудзіны) для ўзмацнення і змякчэння гукаў. Гэта яшчэ раз пераконвае нас у тым, што будаўнічая тэхніка ў старажытна-рускай архітэктуры была выключна высокай.

* * *

БЕЛАРУСКАЯ АРХІТЭКТУРА XIII—XVI СТАГОДДЗЯЎ

Трынаццатае стагоддзе для рускага народа было цяжкім. З усходу на рускія землі напалі манголы і заняволілі іх. Гэта вырашылі скарыстаць продкі сучасных фашыстаў — нямецкія псы-рыцары. Яны пачалі арганізоўваць паходы на паўночна-заходнія рускія гарады, каб заняволіць іх. На шчасце рускі народ сабраў даволі сіл для таго, каб разграміць рыцараў, а праз некаторы час скінуць татарскае ярмо.

Крыху інакш склаўся лёс заходняй часткі вялікай Рускай зямлі. У XIII ст. на тэрыторыі Беларусі існавала некалькі дробных удзельных княстваў, асобныя з якіх маглі ўмясціцца ў межы сучаснага раёна. Гэтыя дробныя аб'яднанні часта ваявалі між сабой. Усё гэта стварыла магчымасці ўтаржэння ў рускія землі суседніх літоўскіх плямён і падпарадкавання заходне-рускіх княстваў Літве.

Беларуская архітэктура ў пачатку развіцця па сутнасці нічым не адрознівалася ад архітэктуры заходне-рускіх княстваў, бо яна з'яўлялася яе непасрэдным прадаўжэннем.

Больш таго, архітэктура Полацкага і Гродненскага княстваў X—XIII ст. ст. зрабіла моцны ўплыў на архітэктуру Літвы. Аб гэтым красамоўна гавораць такія храмы г. Вільні, як Прачысценскі, Троіцкі, Мікалаеўскі і другія, пабудаваныя ў XIV—XVI ст. ст. у руска-візанційскім стылі.

Адрознай асаблівасцю беларускай архітэктуры гэтага перыяду з'яўляецца перавага ў ёй замкавага будаўніцтва над грамадзянскім.

У гэты неспакойны час будавалася многа замкаў і наогул цытадэлевых збудаванняў. У асаблівасці было пабудавана многа цытадэляў на заходняй мяжы Беларусі і Літвы для абароны ад няспынных нападаў нямецкіх рыцараў. Так узніклі замкі ў Брэсце, Каменцы, Лідзе, Міры, Навагрудку, Гродні, Мядзвіках, Вільні, Троках і Коўні. У гэты-ж час у Беларусі паявіліся каменныя будынкі.

Першым каменным замкам у Беларусі з'яўляецца замак у Навагрудку. Пабудаваны ён літоўскім князем Міндоўгам у XIII стагоддзі, калі Навагрудак быў сталіцай княства. Пазней замак некалькі разоў дабудоўваўся. Цяпер ад яго захаваліся ніжнія часткі двух вежаў і асобныя фрагменты сцен.

Калі навагрудскі замак адносіцца да тыпу сталічных, дык замак у Лідзе меў чыста ваеннае прызначэнне і быў збудаваны для воінскага гарнізона, які ахоўваў заходнія межы Беларусі ад утаржэння нямецкіх рыцараў. Пабудаваны ў XIV ст. з камення і цэглы, ён меў даволі моцныя сцены, якія не раз вытрымалі асаду рыцарскіх бандаў. Да нашага часу ад замка захаваліся толькі сцены.

У той-жа час існавалі замкі і ў другіх гарадах Беларусі, як напрыклад Гродні, Магілеве, Мінску, Заслаўі, Тураве і Гомелі.

Замак у Міры пабудаваны беларускім магнатам Ільінічам у XV стагоддзі. Ён належыць да тыпу магнацкіх замкаў і быў прызначаны для аховы жыцця і маемасці яго гаспадара.

Мірскі замак складаецца з чатырох сцен і пяці вежаў з прыстасаваннямі для абароны. Чатыры вежы замка размешчаны па вуглах, а пятая для ўезду стаіць на сярэдзіне сцяны храма і называецца Галоўнай вежай. Складаецца яна з двух частак — ніжняй чатырохкантовай і верхняй васьмікантовай. Яе сцены ўпрыгожаны нішамі, якія маюць розную велічыню і форму і нагадваюць сабой дэкаратыўныя ўпрыгожанні франтонаў Сіньковіцкай царквы. Астатнія вежы ў асноўных сваіх рысах паўтараюць галоўную, аднак дэкаратыўная апрацоўка іх розная, з прычыны чаго кожная з вежаў мае свой індывідуальны воблік, што робіць мірскі замак непаўторным.

Унутры Мірскага замка быў пабудаваны палац. Ніжні паверх быў створаны хутка пасля пабудовы сцен і вежаў і меў зводчатыя пакрыцці. Верхнія два паверхі палаца мабыць былі пабудаваны ў пачатку XVII стагоддзя. Вокны гэтых паверхаў мелі ляпное акаймаванне, блізкае па сваёй форме да акаймаванняў вокан палаца Сапегі ў Мінску, разбуранага немцамі. Залы і пакоі палаца замка былі ўпрыгожаны ляпнымі арнаментавымі ўпрыгожаннямі.

Мірскі замак цікавы для нас не толькі таму, што ён з'яўляецца адным з больш захаваўшыхся замкаў Беларусі, але і таму, што яго кампазіцыя мае заканчаны характар беларускага замкавага зодчества.

ВЕЖЫ І ЦЫТАДЭЛІ. МІНСКІ ЗАМАК

Пачынаючы з XIII стагоддзя, беларускі народ не пераставаў весці барацьбу за сваё нацыянальнае вызваленне. Гэта барацьба асабліва ўзмацнілася, калі Беларусь падпала пад прыгнёт польскіх магнатаў. Рускі народ не пакідаў у бядзе свайго роднага брата-беларуса і аказваў яму заўсёды падтрымку. Не раз рускія цары патрабавалі ад польскіх каралёў спыніць уціск беларускага народа. Аднак каралі і магнаты прадаўжалі праследваць беларускі народ і яго культуру. Гэта прыводзіла да войнаў паміж Польшчай і Расіяй. Адна з такіх войнаў была пры Іване Грозным у XVI стагоддзі. Рускія войскі вызвалілі ў той час большую частку Беларусі. Для ўмацавання межаў Беларусі Іван Грозны пабудаваў многа цытадэляў, як напрыклад Сокал, Красны і другія. У гэты-ж час быў адбудаваны полацкі замак. Будаваўся замак палачанамі пад кіраўніцтвам беларускіх архітэктараў. Іх імёны вядомы. Так Іван Гаўрылавіч Долеў стварыў Чырвоную Раждзественскую вежы, Іван Андрэеў пабудаваў Вусцінскую вежу, а Мацюшка Маркаў пабудаваў вежу Машну. Як сведчаць сучаснікі, вежы былі найпрыгажэйшымі збудаваннямі горада і з'яўляліся асноўнымі абаронными пунктамі горада.

Цяпер на яго месцы захавалася замчышча з рэшткамі цаглянай сцяны цытадэлі.

Замчышча Мінска з'яўляецца самым цікавым месцам горада. Гэта святыня горада. Тысяча год таму назад тут быў крэмль, дзе жылі мінскія князі, адбываліся народныя сходы мінчан і вырашаліся дзяржаўныя пытанні. Замчышча Мінска хавае ў сваіх нетрах шмат рэчаў беларускай і рускай культуры. Гэта ставіць пытанне аб арганізацыі археалагічных раскопак у замчышчы. Гэта можна ажыццявіць у сувязі з планіроўкай горада. Да таго-ж наш абавязак — захаваць гэта старажытнае ядро горада і стварыць на яго месцы гістарычны куток.

* * *

Ужо гаварылася, што ў беларускай архітэктуры XIV—XVI стагоддзяў пераважнае значэнне мела архітэктура цытадэляў. Нават храмы, гэтыя мірныя прытулкі, набылі выгляд цытадэляў. У гэтых адносінах асабліва цікавыя помнікі беларускай архітэктуры XVI стагоддзя, як напрыклад Супрасльская, Сіньковічская і Маламажэйкаўская цэрквы, пабудаваныя ў XVI ст.

Канструкцыі і планы гэтых храмаў бяруць свае вытокі ў архітэктуры заходне-рускіх княстваў.

Новае, што іх адрознівае ад беларускай архітэктуры папярэдняга перыяду, заключаецца ў тым, што ўсе яны маюць прыстасаванні для абароны, якія складаюцца з чатырох вежаў па вуглах, байніц і тоўстых сцен, здольных вытрымаць асаду ворагаў.

Храм у Сіньковічах мае квадратовы план, які заканчваецца трыма абсідамі з усходу і падзелен шасцю васьмікантовымі слупамі на тры нэфы. Такім чынам, тыпалагічна ён цесна звязаны таксама як і другія храмы XVI стагоддзя, з архітэктурай Полацкага і Гродненскага княстваў X—XIII стагоддзяў.

Не меншую цікавасць прадстаўляе для архітэктуры Беларусі Супрасльская царква, пабудаваная беларускім магнатам Хадкевічам. Унутраныя памяшканні храма падзелены па свайму прызначэнню на дзве часткі: прастора для моляшчыхся, размешчаная ў ніжнім паверху храма, і памяшканні для абароны, размешчаныя пад зводамі пакрыцця. Са знадворным светам абаронная пляцоўка звязана байніцамі, праз якія абаронцы храма скідвалі на ворагаў каменні, вылівалі гарачую смалу і вар.

Знадворку байніцы афармлены ў выглядзе пояса, які надае храму разам з вежамі выгляд замка. Унутры храм быў размалёваны насценным жывапісам. Як відаць з літаратурных крыніц, у XVI ст. над роспісам храма працавалі сербскія майстры, што зусім магчыма, бо сувязь Беларусі з Сербіяй і Балгарыяй у тыя часы была даволі цеснай.

Храмы з вежамі будаваліся і ў рускай архітэктуры, як у X—XII стагоддзях, так і ў XVI стагоддзі. Праўда, прызначэнне вежаў у гэтым выпадку рознае. У рускай архітэктуры яны маюць хутчэй дэкаратыўнае значэнне, чым абаронное, у той час як у беларускай — яны выконвалі ролю прыстасаванняў для абароны.

СТЫЛЬ БАРОКА

У XVII ст. у Беларусі паяўляецца стыль барока. Трэба сказаць, што калі беларуская архітэктура наогул слаба вывучана, то барочная архітэктура нам зусім невядома. Але-ж у нашых гарадах ёсць цудоўныя помнікі архітэктуры, пабудаваныя ў стылі барока.

Адрознай рысай беларускай барочнай архітэктуры з'яўляецца яе цесная сувязь з беларускай архітэктурай папярэдняга перыяду. Гэта рыса па-рознаму праяўляецца ў архітэктуры асобных нашых гарадоў.

Разглядаючы помнікі Магілеўскай архітэктуры XVII ст., нам кідаецца ў вочы стылістычная і тыпалагічная блізкасць асобных помнікаў паміж сабой.

Мірскі замак

Найбольш цікавым збудаваннем Магілева з'яўляецца царква Мікалая, пабудаваная ў 1669 г. Яе план мае выгляд выцягнутага ў даўжыню прамавугольніка з папярочным трансэптам. Унутры храм разбіт слупамі на тры нэфы і завершан трыма паўкруглымі абсідамі з усходу.

Сярэднюю частку храма ўвенчвае барабан з главой, а фасад мае дзве вежы.

Такія ў агульных рысах план і знадворны выгляд не толькі царквы Мікалая, але і храма Багаяўлення, Пакроўскай, Успенскай, Петрапаўлаўскай цэркваў Магілева, збудаваных у XVII ст.

Трэба адзначыць дзве асаблівасці, уласцівыя гэтым храмам. Пераважаючым аб'ёмам у іх унутранай прасторы з'яўляецца пярэдняя частка храма, г. зн. падкупалавы квадрат, не толькі таму, што ён большы на сваіх памерах, чым другія прасторавыя ячэйкі храма, але і таму, што ён найбольш ярка асветлены праз вокны барабана. Размешчаны ён у цэнтры і да яго з усіх бакоў прымыкаюць архітэктурныя і прасторавыя аб'ёмы храма.

Гэты прынцып главенства сярэдняй часткі храма яскрава выражаны і ў знадворным выглядзе, дзе найбольш высокай і буйнай па памерах з'яўляецца глава, якая ўвенчвае сяродкрыжжа храма.

Збудаванні такога тыпу ўспрыймаюцца аднолькава з усіх бакоў. Тут няма прыкметнага падзелу паміж багата дэкараваным фасадам і бедна ўпрыгожанымі бочнымі сценамі будынка. Гэта рыса ўласцівая многім помнікам беларускай архітэктуры не толькі XVII стагоддзя, але і больш ранняга часу, як напрыклад Спаскай царквы г. Полацка XII ст. Разам з тым гэта асаблівасць звязвае нашу архітэктуру з рускай і галоўным чынам маскоўскай архітэктурай XVII ст.

Царква Мікалая была размалёвана цудоўным барочным насценным жывапісам. У XIX ст., храм рамантаваўся і барочны жывапіс быў замалёван жывапісам XIX ст., выкананым у рэалістычным стылі.

Выключна вялікую цікавасць для гісторыі беларускага мастацтва мае разбярны драўляны іканастас храма, які нагадвае разбярны дрыўляны іканастас сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве.

Магілеўскі іканастас трэба выдаць альбомам не толькі таму, што гэта першакласны твор беларускага народнага мастацтва, які сведчыць аб вялікай таленавітасці нашага народа, але і таму, што ён дапаможа нашым творчым работнікам - мастакам архітэктарам, скульптарам і ў асаблівасці работнікам прыкладнога мастацтва асвоіць лепшыя ўзоры народнай творчасці і гэтым узбагаціць сучаснае беларускае мастацтва.

Ратуша ў Магілеве пабудавана ў канцы XVII стагоддзя жыхарамі горада. Складаецца яна, як і ўсе ратушы беларускіх гарадоў, з двух частак: корпуса будынка, дзе памяшчалася гарадское самакіраванне і вежы з гадзіннікам і назіральнай пляцоўкай (балюстрадай).

У архітэктурным сэнсе яна цікавая тым, што ў ёй своеасабліва спалучаюцца рысы стылю адраджэння з барочнасцю. Вежа складаецца з некалькіх ярусаў, яе сцены ўпрыгожаны карнізамі, вокнамі рознай формы і велічыні і цягамі.

Па свайму знешняму вобліку і стылістычна яна нагадвае сабой званіцу Івана Вялікага ў Маскоўскім Крэмлі.

Вядомы сімпатыі жыхароў Магілева да Масквы, а таксама іх цесныя гандлёвыя і культурныя сувязі з ёй.

Зусім магчыма, што пры пабудове сваёй ратушы магілеўчане за ўзор абралі званіцу Маскоўскага Крэмля.

Калі ратушная вежа Магілева адносіцца да ранняга перыяда стыля барока, дык гарадская вежа Мінска на Пляцы Волі—спелае барока.

Архітэктура Мінскай вежы цікавая дэкаратыўным афармленнем. Яе сцены маюць увагнутыя і выгнутыя паверхні, вуглы акруглены, карнізы маюць хвалявідную, зігзагападобную форму, вокны прамавугольныя, авальныя або круглыя.

Па стылю яна блізкая да такіх помнікаў мінскай архітэктуры, як будынак архіва на Пляцу Волі. Гэты будынак мае таксама франтон з хвалявіднай паверхняй.

Да перыяда спелага барока адносіцца і Полацкая Сафія. Каштоўнасць гэтага храма для разумення барочнай архітэктуры Беларусі заключаецца ў тым, што ў ёй выразна праявілася сувязь рускай архітэктуры XI—XII ст. ст. з беларускай архітэктурай XVIII стагоддзя.

Гэта блізкасць відаць у апрацоўцы сцен храма пілястрамі і карнізамі, а таксама ў прапарцыянальных адносінах асобных частак храма паміж сабой.

Цікавую групу архітэктуры Беларусі прадстаўляюць драўляныя храмы. Тыпалагічна іх можна раздзяліць на некалькі груп. Найбольш цікавай з іх з'яўляюцца храмы з крыжовым планам, завершаныя пяццю шатрамі з главамі, як напрыклад Ільінская і Троіцкая цэрквы Віцебска.

Сваім паходжаннем яны абавязаны крыжовым храмам рускай архітэктуры XII стагоддзя з аднаго боку, а з другога — яны аднатыповыя з шатровымі храмамі Украіны. Гэта сведчыць, што шляхі развіцця ўкраінскай і беларускай архітэктуры ў асноўным супадалі і што культура Украіны і Беларусі цесна паміж сабою звязана.

Палац Паскевіча ў Гомелі.

Каб даць аб іх некаторае ўяўленне, прывядзем апісанне вежы Чырвонай, пабудаванай Долевым.

«У верхнім горадзе зроблена вежа Чырвоная, якая раней называлася Каралеўскай, зрублена ў 8 сцен, сцены падвойныя, аб двух мастах, з ніжнімі і верхнімі байніцамі, і з обламі, а верх зроблены шатром, пакрыта драніцай, цёсанай у чатыры ярусы, драніца прыбіта жалезнымі цвікамі, а зрублена ў гэтай вежы ўгару з обламі трыццаць вянцоў».

Калі ўзнік горад Мінск, дакладна невядома. Вядома толькі, што ў 1067 г. у Мінску быў замак, пабудаваны полацкімі князямі. Пазней ён некалькі разоў быў разбураны, пасля чаго зноў адбудоўваўся. У апошні раз ён быў адбудаваны рускімі. Мінскі замак быў размешчаны пры ўпадзенні ракі Нямігі ў раку Свіслач на невялікім узвышшы.

ПАЛАЦЫ

У XVII стагоддзі ў Беларусі цытадэльныя замкавыя збудаванні пачалі ўступаць месца палацам.

Замак сярэдневякоўя, як напрыклад Мірскі, быў зусім адгароджаны ад знешняга свету і акружаючай прыроды высокімі і тоўстымі сценамі, пазбаўленымі вакон і дзвярэй. Зносіны са знешнім светам ажыццяўляліся пры дапамозе адзіных варот з моцнымі заваламі.

Жыццё ўладарных асоб і іх служак, якія змяшчаліся ў гэтых замках, было абмежавана гэтымі сценамі, тэрыторыяй замкавага двара.

У XVII ст. культура ўзнялася на больш высокую ступень, павялічыліся імкненні пануючага класа да камфорта і раскошы.

Сярэдневяковыя цытадэльныя палацы, абгароджаныя цытадэльнымі сценамі з вузкімі карыдорамі, нізкімі зводчатымі столямі, з цёмнымі і цеснымі заламі і пакоямі ўжо не задавальнялі магнатаў.

Пачалі ўсюды ўзнікаць палацы-сядзібы па прыкладу французскіх палацавых ансамбляў. У адрозненне ад сярэдневяковых замкаў яны былі цесна звязаны з прыродай, што складала іх неад'емную частку.

Паявіліся палацы з прасторнымі заламі, вялікімі вокнамі, з адкрытымі тэрасамі і лоджыямі, акружаныя садамі і воднымі басейнамі.

Адным з такіх палацаў-сядзіб з'яўляецца Гомельскі палац, пабудаваны Румянцавым у канцы XVIII ст. і потым перабудаваны ў пачатку XIX ст. Паскевічам. У мінулыя часы Гомельскі палац з'яўляўся адным з багацейшых не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Расіі.

Размешчаны палац у садзе, у якім было пабудована многа павільёнаў, мосцікаў, упрыгожаных скульптурамі. Фасад галоўнай часткі палаца аформлены калонным порцікам, які выходзіць на галоўную паркавую магістраль.

У Гомельскім палацы былі багатыя бібліятэка і музей, што славіліся не толькі ў Расіі, але і за мяжой.

Фашысцкія барбары спалілі і разрабавалі Гомельскі палац. Цяпер ён мае выгляд поўруін. Столі, падлогі, дахі знішчаны. Атынкоўка ўнутры абсыпалася, а з ёй абвалілася каштоўная скульптурная лепка.

Выключна вялікую цікавасць для гісторыі беларускага мастацтва маюць драўляныя гарадскія і вясковыя домікі.

Можна сказаць без пераўвелічэнняў, што многія з іх па дасканаласці прапорцый і па тонкасці выканання дэкаратыўнай драўлянай разьбы не ўступаюць лепшым творам каменнага палацавага і царкоўнага зодчества Беларусі.

На жаль, гэтыя скарбы народнага мастацтва Беларусі пакуль не вывучаны. Аб іх мы ведаем вельмі мала. У гэтых адносінах мы далёка адстаем ад Расіі і Украіны.

Цяпер, калі нямецкі фашызм разгромлены, трэба разгарнуць энергічную дзейнасць па вывучэнню мастацтва Беларусі. Трэба паказаць нашаму народу і суседнім краінам скарбы беларускага мастацтва, створаныя рукамі народа-гер...

М. КАЦАР.

ВЫТОКІ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Дзяржаўнае Выдавецтва БССР выпусціла ў свет паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» — цудоўныя помнікі беларускага мастацкага слова. Гэта — амаль паэмы-блізняты. Іх родніць не толькі аднолькавы літаратурны лёс. Яны блізкія па сваёй ідэйна-функцыянальнай ролі. Іх зближае магутны рэалістычны струмень, які прасякае абедзве паэмы, агульная прырода камічнага, што выпікае з кантраста тэмы і яе выражэння, сапраўдны дэмакратызм і народнасць.

Як вядома, наша беларуская «Энеіда навыварат» з'яўляецца адной з шматлікіх камічна-сатырычных перапрацовак «Энеіды» рымскага паэта Вергілія, тых травестыйна-парадыйных твораў, што былі амаль ва ўсіх заходне-еўрапейскіх народаў. Яе непасрэдным літаратурным прататыпам была руская «Вергилиева Энеида, вывороченная наизнанку» Н. Осіпава і ўкраінская «Вергіліева Энеіда» І. Катлярэўскага. Бытуючы доўгі час у рукапісах і вуснай перадачы ў народзе (ва ўрыўках паэма ўпершыню была надрукавана ў 1845 г. у часопісу «Маяк», а цалкам — толькі ў 1908 г. у выданай Е. Карскім брашуры), яна дайшла да нас без прозвішча аўтара і даты напісання. Розныя даследвальнікі прыпісвалі яе то Тамашу Манькоўскаму, які быў адзін час дарадцам у Магілеве, а затым віцэ-губернатарам у Віцебску, то Вікенцію Равінскаму, памешчыку-палкоўніку, які жыў у Дуброўне, Духаўшчынскага павета, Смаленскай губерніі.

Адчувальны ўплыў твораў Осіпава і Катлярэўскага, а таксама асобныя м[illegible]цы ў самім тэксце «Энеіды навыварат» сведчаць аб тым, што яна была створана ўжо пасля Айчыннай вайны 1812 г. прыблізна ў другім дзесяцігоддзі XIX века.

«Энеіда навыварат» у парадыйным плане апавядае пра ліхія прыгоды Энея — адзінага, што застаўся ў жывых ваеначальніка Троі, які ўцёк з групай воінаў пасля разгрому грэкамі гэтага апетага яшчэ Гамерам горада. Гнеў багіні Юноны ледзь не губіць Энея ў моры. Уласная кемлівасць і заступніцтва Венэры — выратоўвае яго. Эней з траянцамі ўдачліва дасягае берага і ветліва прымаецца карфагенскай царыцай Дыдонай, якая пакахала яго. Захоўваючы сюжэтную лінію рускай і ўкраінскай паэмы, наша «Энеіда» не з'яўляецца ні перакладам, ні тым больш простым перайманнем. Таленавіты аўтар паэмы паставіў сваіх герояў у тыпова беларускія абставіны, надзяліў іх рысамі сучаснага яму жыцця, уставіў рад новых малюнкаў і эпізодаў. У выніку пад пяром беларускага паэта Юнона ператварылася ў злую пляткарку, сварлівую ліхую бабу «панскага адроддзя»; Венэра — у клапатлівую сялянку-маці, якая яшчэ любіць павесяліцца, пагуляць, ярка апрануцца; Дыдона — у багатую ўдаву, памешчыцу-прыгонніцу, тэмпераментную і свавольную; Эней — у цямкага, ветлівага чалавека з народа, які заўсёды знойдзе выхад з самага цяжкага становішча ў жыцці і якога толькі акалічнасці прымушаюць бадзяцца па свету; траянцы — у прыгонных сялян, шчырых працаўнікоў, майстроў на ўсе рукі. Прыгоннае права, адносіны сялян і памешчыкаў, чабарніцтва і свавольства чыноўнікаў, сялянскі быт, звычаі і павер'і знайшлі сваё адлюстраванне ў паэме.

Яшчэ больш рэалістычным і ў мастацкіх адносінах спелым творам з'яўляецца «Тарас на Парнасе» — адна з самых папулярных паэм беларускай літаратуры. Колькасць рукапісных спісаў, якія хадзілі да таго моманту, калі паэма была надрукавана (1889 г. — «Минский листок»), не паддаецца ўліку.

Застаўся невядомым аўтар і гэтай паэмы. Даследвальнік Доўнар-Запольскі прыпісваў аўтарства «Тараса» Дуніну-Марцынкевічу, а вядомы беларускі фалькларыст Е. Раманаў — студэнтам Горы-Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі. Некаторыя меркаванні, аснаваныя на аналізе тэкста паэмы, робяць другое дапушчэнне больш пераканальным і праўдападобным.

Сюжэтнай канвой паэмы «Тарас на Парнасе» з'яўляецца апісанне дзіўных прыгод Тараса на Парнасе — месцы жыхарства багоў, муз і паэтаў. Побач з гэтым развіваецца другая тэма — малюнак літаратурнай барацьбы ў рускай літаратуры ў канцы 30-х, пачатку 40-х гадоў.

Вялікай заслугай паэмы было тое, што яна выступіла барацьбітом за рэалізм і народнасць у літаратуры супроць кансерватыўнага сентыменталізма і эпігонаў рамантызма. З захапленнем і павагай гаворыцца ў ёй аб Пушкіне, Лермантаве, Гогалі і Жукоўскім, якія «прайшлі як павы на Парнас». Ім супроцьпастаўляюцца Грэч і Булгарын — «кароткі, тоўсты, як кабан, плюгавы, дужа некрасівы, крычыць, як ашалелы пан». У паэме выкрываецца нячэсная і глыбока шкодная дзейнасць гэтага агента III аддзялення.

Паміж іншым, па гэтаму месцу ў паэме ўдалося зрабіць амаль дакладнае заключэнне аб тым, што паэма была напісана ў 1843 годзе.

Значэнне паэмы яшчэ больш узрастае, калі ўлічыць, што яна біла па рамантызму і прымітыўнаму бытавізму творчасці беларускіх пісьменнікаў таго часу — Рыпінскага, Чачота, Баршчэўскага, маладога Дуніна-Марцынкевіча, вызначала кірунак для будучага развіцця беларускай літаратуры.

Не гледзячы на тое, што персанажамі паэмы «Тарас на Парнасе», як і ў «Энеідзе навыварат» з'яўляюцца жыхары старажытна-грэчаскага Алімпа, у паэме паказан рэальны, тыпова беларускі сялянскі быт і прырода, праца і адпачынак, гаспадарка і харч, хата і двор беларуса. Зеўс — гаспадар Парнаса, як глава сялянскай сям'і, ляжыць па печы, усе слухаюць яго, імкнуцца дагадзіць. Геба — яго жонка, працавітая і руплівая жанчына, Венэра — сялянская дзяўчына-прыгажуня, якая «перад люстрам залам меліць і маслам мажаць валасы ды нечым белым твар свой беліць». Амур — вясёлы вясковы хлопец-сэрцаед.

Але самым выдатным вобразам паэмы з'яўляецца сам Тарас — бедны селянін, панскі ляснік. Ён ахоўвае абшарніцкія балоты і лясы «з першых петухоў» да позняй ночы. Цудам трапіўшы ў дзень Кузьмы-Дзям'яна на Парнас, ён па-дзіцячаму здзіўляецца багаццю боскай гаспадаркі — новай хаце, яловаму тыну, вялікай колькасці жывёлы, бесклапотнаму жыццю багоў, іх смачнай страве, ад якой

Аж слюні пацяклі ў Тараса
І забурчэла ў жываце.

Відаць, не часта даводзілася Тарасу сытна і ўволю паесці. Апрануты Тарас дрэнна. Аднак, гэта не перашкаджае яму быць вясёлым, жыццерадасным, эмацыянальным чалавекам, які любіць прыроду, умее цаніць яе харастро. Тарас — цікаўны чалавек з актыўнымі адносінамі да рэчаіснасці. Яго ўвага спыняецца на ўсім, што ён заўважае новага, прычым Тарас заўсёды выказвае свой, часам наіўны, але хітраваты і крыху скептычны, погляд на бачанае. У ім няма рабскага жадання прыслужыцца, трымаецца ён незалежна, а калі палохаецца, то не ад недахопу смеласці, а ад сціпласці і сарамлівасці. Ён любіць працу, работа для яго — арганічная неабходнасць.

Чуць золак, ён стрэльбу за плечы,
Заткнець сякеру за паяс—
Заўсёды ходзіць бор сцярэгчы
І птушак біць з ружжа Тарас.

Мова яго сакавіта-вобразная, напеўная, сапраўды народная. У ёй — здаровы юмар, аптымізм, адчуванне ўласнай чалавечай годнасці Тараса. Гэта першы рэалістычны вобраз беларуса ў нашай літаратуры, вялікі крок уперад ад Энея, які быў яшчэ пазбаўлены тыповых нацыянальных рысаў і паданы ў шаржыраваным плане. Не могуць ісці ў параўнанне і пакрытыя сентыментальна-навучальным глянцам схематычныя вобразы сялян вышэйпамянёных беларускіх пісьменнікаў-сучаснікаў.

Тарас — літаратурны продак палясоўшчыка Міхала з «Новай зямлі», дзеда Талаша з «Дрыгвы» Я. Коласа і другіх герояў нашай сучаснай літаратуры. Такім чынам гісторыка-літаратурнае значэнне «Энеіды навыварат» і «Тараса на Парнасе» заключаецца ў тым, што яны знаменавалі сабою пачатак новай беларускай літаратуры, вызначылі кірунак яе будучага развіцця і сцвердзілі агульнасць шляхоў для беларускай і вялікай брацкай рускай літаратуры. Роля гэтых паэм у гісторыі беларускага прыгожага пісьменства відавочная.

У наш час паэмы выдаваліся неаднаразова, і апошні раз — у 1940 годзе ў зборніку БелАН «Беларуская літаратура XIX стагоддзя». Аднак, нямецка-фашысцкія вандалы разрабавалі і спалілі скарбніцы чалавечай думкі — нашы бібліятэкі, дзе разам з мільёнамі кніг загінулі зборнікі, у якіх былі надрукаваны гэтыя цудоўныя помнікі. Адсюль робіцца зразумелым, якую карысную справу зрабіла Дзяржаўнае Выдавецтва БССР, калі нанава выдала тыражом у 25000 экземпляраў паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе».

Ул. КАРПАЎ.

Ілюстрація мастака Басава да кнігі Я. Коласа «Вершы для дзяцей».

А. Платнер.

КАЛІ ЛАСКА

Тры гады я не маю спакою ні звання,
тры гады як са мною—туга развітання.
Адзначаю сягоння гаротную дату—
дзень, калі пакідаў сваю родную хату.
А наўкол—разліваецца спелае лета,
каласамі шуміць урадлівы палетак,
зацвіло на ім неба валошкаю сіняй,
як і ў нашай далёкай-далёкай краіне.
Людзі йдуць, і са мною спыняецца кожны,
і я ў кожнага найлепшага сябру знаходжу,
а туга не змяншаецца нават на волас,
хоць на тысячу дзён пасталеў яе голас.
Часта-густа здараецца: зойдзе размова,
у мяне вырываецца роднае слова —
—Калі ласка!—прамоўлю, а сябар адчуе,
што я ўбачыў краіну ласкавую тую,
дзе з парогу вітаюць:
— Заходзь, калі ласка!
дзе за стол запрашаюць:
— Сядай, калі ласка!
дзе руку паціскаюць:
—Прыходзь, калі ласка!
І я маю салодкім сваім абавязкам
гаварыць, паўтараць без канца:—калі ласка!
Найсвятлейшае слова між слоў Беларусі,
я з табою жыву і дадому вярнуся!
І тады толькі сціхне ў сэрцы трывога,
калі сам запрашу я гасцей ад парога:
— Калі ласка!

Чэрвень, 1944 г.

Пераклад з яўрэйскага
Максіма ЛУЖАНІНА.

Кастусь Кірэенка.

МАТЧЫНА ПЕСНЯ

Калі яна ў сэрца мне запала,
Калі на ўсё жыццё зачаравала
Цудоўная, як радасць на прадвесні—
Матчына песня?

Таго не помню. Толькі добра знаю,
Што ўсёй душой любіць цябе, мой краю,
Мяне з маленства навучыла ўмесьне
Матчына песня.

Нялёгкі выпаў лёс на нашу долю—
Хто звяў ад слёз, а хто памёр у полі.
Але жывых вяла да родных весніц
Матчына песня.

Яна глытала дым у пекле боя.
Праз жах, праз гора, сцежкаю любою
Ішла са мной да перамогі весняй
Матчына песня.

І знаю я, што на шляху жыццёвым
Я ўсё змагу, усё вярну нанова,
Бо ў сэрцы б'ецца радасным прадвеснем
Матчына песня.

Ілюстрацыя мастака Басава да кнігі Я. Коласа «Вершы для дзяцей».

«Гейша» Джонса ў пастаноўцы Дзяржаўнага тэатра музкамедыі БССР. На здымку: Канстанцыя—арт. Э. Грасава, Джульета — арт. І. Мікуліна і Імары — арт. А. Любаў.

ДРУГІ СТРУННЫ КВАРТЭТ М. АЛАДАВА

М. І. Аладаў справядліва лічыцца адным з вядучых дзеячоў беларускай савецкай музыкальнай культуры. За 20 год сваёй кампазітарскай, педагагічнай і арганізатарскай дзейнасці ў Беларусі ён паказаў сябе, як нястомны працаўнік у галіне савецкага музыкальнага мастацтва.

Творчасць Аладава ахоплівае амаль усе жанры музычнага мастацтва—ад буйных манументальных форм (опера, сімфонія) да песень.

У галіне інструментальна-сімфанічных і інструментальна-вакальных форм ім напісаны: дзве сімфоніі (адна з іх—на беларускія тэмы); уверцюра-фантазія «Зары насустрач»; сімфанічная паэма «Мацней за смерць», прысвечаная Х-годдзю з дня смерці Ул. І. Леніна; лірычна-драматычная фантазія «Казка-быль» у 3 частках, прысвечаная эпапеі чэлюскінцаў; сімфаньета; уверцюра-фантазія «Дума пра пагранічніка Лагоду»; сімфанічная паэма «З дзённіка партызана»; балада для сімфанічнага аркестра «Суровыя дні»; паэма на словы народнага паэта Беларусі Янкі Купалы «Над ракой Арэсай» для салістаў, хора і аркестра; капрычыо на беларускія народныя тэмы; аднаактавая камічная опера «Тарас на Парнасе».

Рознастайная творчасць кампазітара і ў песенна-рамансавым жанры. Яго пяру належаць вакальны квартэт з фортапіянным суправаджэннем, сатырычны дуэт «Калядная размова» на словы К. Крапівы і звыш ста рамансаў, песень, хароў, шмат апрацовак беларускіх і чувашскіх народных песень.

Найбольш пладавіты кампазітар у раздзеле камерна-інструментальнай музыкі, дзе ён паказаў сябе асабліва ярка за апошнія гады. Вось пералік яго твораў: нонэт (напісан для струннага квартэта, флейты, кларнета, валторны, фагота і фортапіяна), фортапіянны квінтэт, два струнных квартэты на беларускія тэмы, фортапіяннае трыо, саната для скрыпкі, санаціна для валторны і фортапіяна, варыяцыі і скерца для двух труб, двух валторнаў і двух трамбонаў п'еса для фортапіяннага трыо «Не зламаць», прысвечаная памяці С. М. Кірава.

Вялікая музычная культура, багатая кампазітарская тэхніка і майстэрства, якім кампазітар валодае ў дасканаласці, заслужана ставяць М. Аладава ў рад з лепшымі музычнымі творцамі нашай краіны. Пералічаныя якасці дазваляюць аднесці Аладава да той катэгорыі беларускіх кампазітараў, творчасць якіх выходзіць за межы вузканацыянальных рамак.

Творчасць М. Аладава знаходзіцца пад непасрэдным уплывам беларускага музычнага фальклора. Элементы беларускай народнай песні, перапрацаваныя Аладавым, надаюць яго творчасці асаблівую свежасць і арыгінальнасць, а ў спалучэнні з вялікай кампазітарскай тэхнікай служаць трывалай асновай стылю музыкі кампазітара.

Меладычныя і гарманічныя рысы яго музыкі цесна звязаны з ладавай будовай беларускай народнай песні, з яе рытмікай. Асабліва ярка адчуваецца гэта ў другім струнным квартэце.

Другі струнны квартэт напісаны кампазітарам у 1943—1944 г. г. У суровыя дні Вялікай Айчыннай вайны, калі Совецкая Беларусь яшчэ знаходзілася пад прыгнётам нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Аладаў горача адгукнуўся на просьбу артыстаў Беларускага струннага квартэта аб напісанні для іх твора.

Змест твора — глыбокі смутак, журба па роднай Беларусі, якая стагнала пад ботам акупантаў, барацьба і ўрачыстасць перамогі. У аснову твора, што складаецца з 2-х частак, пакладзена пяць беларускіх тэм. Дзве з іх запазычаны з беларускіх народных песень: «Ой, у полі жыта» (першая тэма 1-й часткі) і «Як пайшла я на талаку» (першая тэма 2-й часткі), а астатнія — стылізаваныя.

Галоўная тэма першай часткі — асноўны лейтматыў усяго твора. Гэта тэма нібы канцэнтруе ў сабе ўвесь трагізм, увесь цяжар выпрабаванняў, якім падвяргаўся беларускі народ пад ярмом нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яна насычана драматызмам. Невялікая па дыяпазону, некалькі аднастайная ў структурна-тэматычных адносінах, гэта тэма напісана ў глыбокім міноры. Своеасаблівы, непакойны рытм уступу праходзіць праз увесь твор у партыях віяланчэлі і альта і служыць фонам, які ўдала перадае агульны настрой.

Другая тэма (пабочная) таксама апавядае аб цяжкіх перажываннях, навеяных ваеннымі падзеямі. Яна да некаторай ступені кантрастуе з першай тэмай. Шырокая напеўнасць мелодыі ў верхнім рэгістры засурдзіненых скрыпак уводзіць як-бы ў новы свет перажыванняў, разгортвае карціну ўспамінаў, звязаных з журбой па роднай беларускай зямлі. Правядзенне тэмы ў другі раз, у ніжнім рэгістры альта, падтрымане сумнай мелодыяй, якая контрапунктыруе і аснована на храматызме, прадвяшчае паяўленне ўсхваляванага, непакойнага рытмічнага элемента ўступу першай тэмы. У распрацоўцы, аснаванай на развіцці лада-гарманічных і тэматычных элементаў, кампазітар па-майстэрску дасягае вялікага драматычнага напружання і кульмінацыі сутыкненнем двух тэм, двух настрояў, розных па характару, але аб'еднаных агульнасцю сюжэта. Рэпрыза больш сціслая, больш насычаная. Галоўная тэма пераўтварылася: яна, крыху вар'іраваная і відазмененая, носіць у пачатку некалькі жалобны характар.

Другая тэма (пабочная) таксама пановаму прадстаўлена: перад намі не столькі лірычная і гаротная тэма экспазіцыі ў далёкай ладатанальнасці і ў высокім рэгістры засурдзіненых скрыпак, колькі больш спакойная, менш эмацыянальна насычаная, прычым у другой ладатанальнасці.

Шырока развітае заключэнне (кода), аснаванае на матэрыяле экспазіцыі, прыводзіць да жыццесцвярджаючага заканчэння ўсей часткі.

Другая частка (фінал) пабудавана ў форме санатнага алегра і складаецца з двух асноўных тэм (галоўнай і пабочнай) і адной невялікай звязваючай, якая носіць эпізадычны характар і не атрымала больш ці менш значнага развіцця. Аб'едноўваючым пачаткам абодвух частак, прасякнутых адзінай ідэяй, з'яўляецца барацьба і імкненне да дасягнення агульнай мэты — вызвалення радзімы. Сутычка двух тэм у першай частцы, якая прывяла да вялікага драматычнага напружання, не ажыццявіла жаданай мары, не дала станоўчага вырашэння. Пачуцці напружаны. Імкненне да дасягнення пастаўленай мэты велізарнае. Зноў незадаволенасць, сумненні, пошукі...

Галоўная тэма гэтай часткі адрозніваецца ў структурна-тэматычных адносінах і агульным характарам ад той-жа тэмы ў першай частцы. Тут—рухомае, імклівае правядзенне тэмы фугата ў ніжніх рэгістрах віяланчэлі, альта і скрыпак хоць і носіць у некаторай ступені характар незадаволенасці і замяшання пачуццяў, цалкам робіць жыццесцвярджаючае ўражанне. Параўнуўча спакойнае развіццё тэмы, якое ўсё больш ускладняецца драматызмам і непакойным рытмам уступу да першай часткі, прыводзіць да нязначнага драматычнага напружання. Гэты настрой яшчэ больш узмацняецца непадрыхтаваным паяўленнем эпізадычнай тэмы (звязваючай часткі) ў змрочным міноры галоўнай ладатанальнасці. Атмасфера разраджаецца паяўленнем характэрнай інтанацыі (інтэрвала ўзыходзячай квінты), якая ідзе раней уступлення фінальнай тэмы, тэмы перамогі.

Пабочная тэма фінала гучыць, як тэма перамогі. Па свайму характару і настрою яна з'яўляецца кантрастам, які дасягнуты ў выніку працяглай барацьбы і сутычкі розных пачуццяў, закладзеных ва ўсіх папярэдніх тэмах. Прадстаўленая ў светлым мажоры, гэта тэма гучыць шырока, пявуча, жыццерадасна. Паўторнае правядзенне тэмы першай скрыпкай спыняецца раптоўным танальным зрухам, які прыводзіць сваім далейшым няспынным развіццём да заключнай партыі, што пачынаецца на матэрыяле экспазіцыі.

Трохразовае правядзенне гэтага матэрыяла, які па-рознаму асвятляецца ладатанальна і рытмічна, дасягае сваёй кульмінацыі паяўленнем у высокім рэгістры скрыпак (у актаву) трагічнага элемента галоўнай тэмы першай часткі. У апошні раз гэта тэма напамінае аб сабе. Павольна, у высокім рэгістры і ў глыбокім міноры, засурдзіненыя скрыпкі ў актаву ўспамінаюць аб цяжкіх днях, аб пакутах, якія ўжо засталіся ззаду, у мінулым. Рамантычна афарбаваная тэма рухаецца ўжо больш упэўнена і, пераадольваючы на сваім шляху непакойны рытм і храматызм, прыводзіць да рэпрызы. Рэпрыза мадэрнізаваная. Галоўная тэма больш суцэльная, рашучая, гучыць магутна і ўпэўнена Пабочная тэма спачатку ў субдамінанце, а потым у аднаіменным мажоры, рухаючыся няспынна ўпэўненым крокам, прыводзіць да ўрачыстага заключэння.

Зроблены разбор гэтага твора дазваляе канстатаваць вялікую творчую ўдачу кампазітара.

Абумоўленыя праграмным характарам твора непасрэднасць і даступнасць меладычнай лініі, заснаванай на тыповых інтанацыях і характэрных ладарытмічных выразах беларускага песеннага фальклора, прастата і яснасць ладатанальнага і мадуляцыйнага плана твора, выдатнае веданне спецыфікі струннага квартэта забяспечылі аўтару заслужаны поспех.

Другі струнны квартэт — манументальны музычны твор, які, дзякуючы мастацкім вартасцям, свайму ідэйнаму зместу і настрою, становіцца зусім даступным для ўспрыймання нават малападрыхтаваным масавым слухачом.

Не падлягае сумненню, што квартэт, з'яўляючыся каштоўным укладам у скарбніцу беларускай музычнай культуры, увойдзе ў рэпертуар канцэртных арганізацый Беларусі і ўсёй нашай Совецкай Радзімы.

М. ШЫФРЫН.

Янка Брыль

ЗЛАДЗЕІ

(Урывак з апавядання)

★ ★ ★

Янка Брыль—малады празаік, нядаўна прыняты ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Ён жыў у былой Заходняй Беларусі, што вызначыла тэматыку і змест яго першых твораў.

Ніжэй мы друкуем урывак „Зладзеі" з аднаіменнага апавядання, напісанага пісьменнікам у 1938 годзе. У змешчаным урыўку паказана бяздольнае жыццё дзяцей заходне-беларускай вёскі ва ўмовах панскага прынёту.

Вострая назіральнасць, тонкія і скупыя рысы псіхалагічных замалёвак, шчырая цеплыня, характэрныя для творчасці Янкі Брыля, — відны і ў гэтым невялічкім урыўку.

Тымчасам Косцік і Шурка ішлі ў панскі лес.

Косцік ішоў уперадзе, падперазаны разачком, як сапраўдны лясун, а за ім дрэпаў Шурка, засадзіўшы адубеўшыя без рукавіцаў ручкі ледзь не па локці ў кішэні портачак. Сумачка з кнігамі і сшыткамі апусцілася амаль на цяглі. Колькі каштавала Шурыку ўпрасіць Косціка ўзяць яго сёння з сабой у лес, — і вось ён нарэшце ідзе! Ні тата, ні мама не будуць ведаць аб гэтым: прыйдзе ён — быццам са школы.

Сняжок хрумсціць пад нагамі. А сонца, сонца!..

— Прыйдзем, Шурка, пад бярозку,— кажа Косцік, — падсядзем: шаргу-шаргу-шаргу... Большае галлё разачком, меншае — ножыкам і выражам цялеж...

Шурыку ўспамінаецца татава казка пра Пілпку-сынка: «паехаў дзед у лес і высек цялеж»...

— Як тое, Косцік, што тата баяў,— кажа ён і шморгае носам.

— Не-е, тое — казка, — адказвае Косцік. — А вось я вырасту яшчэ большы і ў нас будзе свой конь, і я буду ездзіць у лес.

— І я таксама, ого!..

— Не, ты будзеш яшчэ ў школу хадзіць. А я не: хопіць з мяне, і так няма з чаго жыць.

Гэтак казала надоечы мама, але Косціку здаецца, што і ён думае таксама, бо ён большы за Шурку.

— А я тады буду яшчэ бальшэйшы і таксама буду ездзіць у лес, —кажа Шурка, каб растлумачыць, што і ён калісь кончыць школу.

— Не, брат, ты яшчэ смаркач!

Шурка ў адказ толькі шморгае носам і выцірае яго адубеўшым чырвоным кулачком. І як гэта ён рукавіцы забыўся?..

А ўжо пачаўся лес, — уперад кусты на куп'і, пасля прылесак, — бярозкі, дубкі, алешнік, ёлачкі быццам кваптухі на яйках. А сонца, сонца!..

— Вось зайчык бег,—паказаў Косцік, калі яны звярнулі з дарогі на цаліну, у кусты.

— Дзе?

— Во сляды, бачыш, во! Гэта і гэта. Двума ножкамі... ці, праўда, чатырма.

І праўда: ад ёлачкі — заячыя сляды, быццам нехта бягучы стукаў кіёчкам. Пасля пачаліся яліны, бярозы, алешнік, асняк. Зрабілася зацішней і пацяплела. На ялінах, быццам свечкі на каляднай ёлцы, віселі шышкі-таўкачы і залаціліся на сонцы. Нешта заварушылася ў зялёным іголлі, і на сонцы заіскрыўся, пасыпаўшыся, снежны пыл.

— Ціха-а, — шапнуў Косцік, — гэта вавёрка. Я крыкну, — от дзе пойдзе!..

Шурка і так маўчаў, уталопіўшыся, як кот на мышыны шэлест у саломе.

— Ага!! — гукнуў з усёй моцы Косцік. Шурку ажно сцепанула. «Ага!» — ёкнула між дрэў глухое зімовае рэха. Прыціхла зноў, а на яліне ўсё-ж такі нешта варушылася. У вершняку шушукала: гэта ветрык поўзаў па вяршынах. А так—ціхенька ўсё, толькі сінічкі: ці-сік, ці-сік, ці-сік...

— Ну, рэжма, Шурка, а то ты ўжо замёрз. Вось гэтую.

А гэта была бярозка, — пярэстая, касатая, як і ўсе нашы бярозкі. Вакол яе — казіныя сляды.

— Што гэта, Косцік, хадзіла,— авечкі?

— Але, авечкі! Козы дзікія, сарны...

І чаго-ж ён смяецца, гэты Косцік?.. А-а, жулік, таўхануў рукой бярозку, а сам хуценька нізка прыгорбіўся. Пякучы снежны пыл сыпнуў з галля на Шурыка. І на твар і за шыю палез...

— Ы-ы! Косцік-хвосцік! — я скажу ма-а-ме-е, — захныкаў Шурка.

— От, ты хіба, дурненькі, — лаецца ў лесе!.. Не плач, гэта-ж добранька, сняжок. Бачыш, які ён блішчасты на сонцы!..

Угаварыў малога, асцепаў і пачалі рэзаць. І праўда: разачок звонка—шаргу-шаргу-шаргу, а на снег сыплюцца пілавіны. Яны пырскаюць і на рукі Шурыку і на твар, адна папала на вока і пячэ. Шурка змахнуў яе рукой і зноў шаргу-шаргу-шаргу...

— Ты не віляй рукамі, не цісні!—дасадуе Косцік. Шурка як мага стараецца не віляць, а ўсёроўна віляе. Шаргу-шаргу-шаргу...

— Уух, як цяжка з табой! — уздыхае Косцік і садзіцца на нагу.

— Ручкі мае памерзлі... — не вытрымаў Шурка.

— Памерзлі! Дык і я-ж без рукавіцаў. Снегам вазьмі патры. Або не: ты-ж яшчэ малы. Вазьмі пабі аб плечы. Бачыў, як я рабіў?..

Шурка ўстае, адступаецца і размахвае адубелымі ручкамі...

— Ай-ёй! — закрычаў ён і заплакаў.

— Што ты, што? — схапіўся Косцік.

— А во! — паказаў Шурка ручкай убок. А гэта другая бярозка. Шурка выцяўся аб яе запясцю і на дадатак зноў абсыпаўся пякучым снегам. «А-а-а» — плакаў ён, трымаючыся за ручку.

— Ты, Шурка, ты не плач, а то стражнік пачуе,—дасць нам прачуханца!..

— А-а-а, — не пайду табе больш у лес... нік-кол-лі-і...

І разак забярэ... Ціха ты, разява! На ўвесь лес... Пачакай — я кончу адзін, а рука перастане. Ты толькі не крычы.

Шурка паслухаў Косціка і з моцнага «а-а-а» перайшоў на ціхенькае «ы-ы-ы», як цюцька. А ручка гэтак баліць, а пасля гэтак зайшла ад пары!..

— Шаргу-шаргу-шаргу—працаваў разачок. А пасля сталася самае прыгожае: бярозка пахілілася, Косцік папхнуў яе раз і яшчэ і яшчэ раз, і бярозка-крр-рах — легла на снезе, і неяк раптам паменшала.

— Вось табе як! — весела крыкнуў Косцік. — А гэтую дурніцу, што цябе, Шурка, выцяла, — возьмем ды заўтра спусцім. Ты толькі не плач! Баліць яшчэ?

— Трошкі, — хныкнуў Шурка.

Пакуль Косцік церабіў бярозку—Шурка глядзеў. Ручка перастала бялець. І неяк шкада зрабілася, што па ўсім ужо і трэба дахаты...

— Косцік...

— Га?

— А мнажэй не будзем рэзаць?

— Больш, нашто? Заўтра. А цяпер борздзенька пойдзем. А то мы тут накрычалі, накрычалі...

Косцік ізноў падперазаўся разачком, узяў на плечы пярэставы бярозавы цялеж, і яны пайшлі па снезе ў той бок, дзе была вёска. Абы крануў тым ці тым канцом целяжа аб бярозку, ці алешынку, — зверху зноў церушыўся снежны пыл, пякучы і бліскучы, бо сонца, сонца!..

І думаецца-ж ім, усім тым панам і кулакам, якія захапілі лясы ад беднаты, што гэты лес іхні, а не тых, каму ён патрэбен!.. Ды дзеці аб гэтым і не думалі. Старэйшы, Косцік, думае толькі аб тым, што трэба асцерагацца, бо як зловяць — наб'юць. А Шурка на'т і гэтага не думае. Ён ужо не баіцца снегу. Ён тралюе ўслед за Косцікам, разнімаючы ручкамі галінкі і лапкі. Снег сыплецца, ды ўжо не гэтак пячэ, а ручкі бадай і зусім не мерзнуць.

— Я не баюся, Косцік, — кажа ён аб снезе, а Косцік адказвае яму тонам сапраўднага ляснога злодзея:

— А чаго-ж? Абы з лесу — і па ўсём! Што ты мяне злавіў, ці што?

А пад нагамі, дзе тупчэй і пасля, на дарозе — бадзёра шаскрыпвае снег.

Нараджэнне тэатра

З вызваленнем Беларусі абласныя тэатры аднавілі сваю работу. У Палескай абласці пастаўлена ўжо некалькі спектакляў. Працуе тэатр Бабруйскай абласці. Рэчыцкі гарадскі тэатр з канцэртнай праграмай гастраліраваў у Заходніх абласцях Беларусі. Арганізуецца Гомельскі тэатр. Будзе створаны тэатр у Пінску.

Народны артыст БССР Г. Глебаў у ролі Нічыпара з драмы «Заложнікі» А. Кучара.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў у Баранавічы, на старое месца працы, пачалі з'язджацца артысты. Вярнуўся на сваю былую пасаду і рэжысёр Я. Танальскі. Так нанава пачалося жыццё тэатра. І вось да дню Чырвонай Арміі рэжысёр Я. Танальскі ставіць камедыю-рэв'ю В. Маса і Г. Чарвінскага «Недзе ў Маскве».

Гэта была пробная праца, дзе акторы творча знаёміліся адзін з другім, знаходзілі адзіную сцэнічную мову, трымалі экзамен — на што яны здольны.

Мастацкі кіраўнік Я. Танальскі ў гэтым спектаклі з'яўляецца пастаноўшчыкам і выканаўцам. Таму на яго долю выпала цяжкая задача.

У рэжысёрскай трактоўцы камедыі «Недзе ў Маскве» акцэнтуюцца аптымістычныя матывы. Тэма шчыльнай сувязі воіна Чырвонай Арміі з народам асабліва пераканаўча перадана ў вобразах лейтэнанта Мельнікава, Нюры і насільшчыка Каваленкі. Гэтым ужо рэжысёр сцвярджае, што ён ставіць спектакль не ў плане рэв'ю (спалучэння раду эстрадных нумароў), а ў плане цэльнага камедыйнага відовішча. Драматычны твор, які мы разглядаем, цікавы тым, што сюжэт яго пабудаваны на чаргаванні лірычных сцэн з камедыйнымі.

Артыст Я. Танальскі ў трактоўцы вобраза лейтэнанта Мельнікава ярка перадае пачуццё ўдзячнасці чалавеку, які выратаваў яго жыццё. На шляху пошукаў гэтага чалавека лейтэнант сустракаецца з рознымі совецкімі людзьмі, і яны ставяцца да яго па-рознаму. Ён трымае сябе таксама неаднолькава, дзякуючы чаму трапляе ў камічныя сітуацыі. Асабліва выразная ігра артыста ў момантах сустрэчы з дзяўчынай Нюрай, якая выратавала яго ад смерці.

Нюра ў выкананні артысткі Е. Ерпічавай — вобраз благароднай совецкай дзяўчыны. Артыстка падкрэслівае сціпласць, дзявочую сарамлівасць і зусім не акцэнтуе на сваім геройскім учынку.

Дапаможным з'яўляецца ў п'есе вобраз насільшчыка Каваленкі. Артыст Г. Ружынскі іграе суха, невыразна, у пачатку нават няўважліва, што значна зніжае мастацкую вартасць гэтага вобраза і не перадае прывабнасці адданага совецкага чалавека.

Значныя здольнасці праявіла ў эпізадычнай ролі балбатлівай і лёгкадумнай студэнткі артыстка А. Ляонава.

Трэба заўважыць, што некаторыя акторы, як В. Чарняўскі (рабочы), Н. Багданаў і Ф. Карнееў (архітэктар), Е. Крылова (артыстка) горш справіліся са сваімі ролямі.

Прыемна адзначыць і тое, што асноўная думка камедыі правільна данесена да гледача, таму спектакль выклікае патрыятычныя пачуцці любві да нашай Радзімы, да гераічнай Чырвонай Арміі і цудоўнага совецкага народа.

Нам хочацца падкрэсліць, што ў Баранавічах сур'ёзна думаюць аб стварэнні тэатра.

Кіраўніцтва тэатра і аддзела мастацтва збірае актораў, якія працавалі да вайны, запрашае новых, папаўняе трупу лепшымі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці.

А. ЕСАКОЎ.

ТЭАТР ЛЯЛЕК БССР

Дзяржаўны тэатр лялек БССР абслугоўвае дзяцей непасрэдна ў школах. Стала гэты тэатр знаходзіцца ў Гомелі, але ён пабываў ужо і ў Мінску, а таксама гастраліруе па абласных і раённых гарадах рэспублікі.

У яго рэпертуары рознастайныя і цікавыя пастаноўкі — «Цудоўны кошык» С. Маршака, «Каштанка» Спяранскага (інсцэніроўка апавядання А. П. Чэхава), «Вялікі Іван» Абразцова і Прэабражэнскага і «Па шчучаму вяленню» Е. Тарахоўскай. Усе гэтыя спектаклі пастаўлены мастацкім кіраўніком тэатра М. Бабушкіным, дэкарацыі і лялькі зроблены па эскізах мастака Б. Звенігарадскага. У паказах заняты артысты С. Дзям'янава, Н. Правіст, А. Какора. Калектыў налічвае 17 работнікаў. Спектаклі глядзелі каля 100 тысяч дзяцей.

Цяпер тэатр прыступае да працы над арыгінальнай беларускай сцэнічнай казкай В. Вольскага «Дзед і жораў».

НАШ СЯБРА, НАША ЗБРОЯ!

Калі ў незабыўныя ліпеньскія дні 1944 года група беларускіх пісьменнікаў разам з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі ўвайшла ў толькі што вызвалены Мінск, іх зацікавіў лёс кнігі ў родным горадзе.

Да 22 чэрвеня 1941 года — чорнага дня фашысцкага нападу на совецкія землі, Мінск быў сталіцай кнігі нашай рэспублікі. Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна, створаная ў першыя-ж гады арганізацыі БССР, набыла сусветную славу і ўстанавіла кнігаабмен з буйнейшымі бібліятэкамі Еўропы і Амерыкі. Для бібліятэкі быў пабудаваны спецыяльны будынак з прасторнымі, багатымі заламі.

У гэтай бібліятэцы можна было знайсці любую кнігу, якая выйшла не толькі за час совецкай улады, але і раней. Тут можна было атрымаць кнігу, выданую не толькі ў Маскве, Мінску, Кіеве, але і ў Владзівастоку, Хабараўску, Растове — усюды. Асабліва багаты быў беларускі краязнаўчы аддзел бібліятэкі. Яму не было роўнага ў свеце. Тут хаваліся ўсе беларускія выданні, пачынаючы ад бібліі першадрукара Георгія Скарыны. Стараннай працай супрацоўнікам бібліятэкі ўдалося сабраць для краязнаўчага музея ўсё тое, што было выдана за 420 год беларускага кнігадрукавання. Тут можна было знайсці ўсе творы Яна Чачота, Вінцука Дунін-Марцынкевіча, Францішка Багушэвіча, вядомага даследчыка Е. Карскага, этнографа-збіральніка народнай беларускай творчасці Шэйна, усе выпускі «Энеіды навыварат» і «Тараса на Парнасе», «Мужыцкую Праўду» Кастуся Каліноўскага і многія другія выданні, якія складалі нашу нацыянальную гордасць. Янка Купала і Якуб Колас захоўвалі ў бібліятэцы свае рукапісы і пісьмы. У сейфах беларускага аддзела захоўваліся і другія рукапісы. Тут можна было азнаёміцца з нявыданымі творамі Каруся Каганца, з пісьмамі. Цёткі і многімі другімі экспанатамі, якія ў далейшым павінны былі скласці літаратурны музей Беларусі.

Кніжная палата бібліятэкі выдавала бібліяграфічныя бюлетэні аб усім тым, што выходзіла на беларускай зямлі. Акрамя таго, вяліся картатэка і каталаг бібліятэкі, якія ўлічвалі творы беларускіх пісьменнікаў аж да вершаў і апавяданняў, што друкаваліся ў кожнай раённай газеце. Янка Купала пры складанні сваіх зборнікаў карыстаўся дапамогай бібліографаў бібліятэкі.

Бібліятэку імені Ул. І. Леніна па колькасці сабраных у ёй кніг да вайны ставілі на трэцяе месца ў Совецкім Саюзе — гэта была кніжная скарбніца беларускага народа ў поўным сэнсе слова.

Мінск быў багаты і другімі бібліятэкамі. Яны існавалі ў кожным раёне горада, пры кожным клубе, пры кожнай школе, ва ўніверсітэце, у Доме Партыйнай Асветы, у Доме Урада. 5.000.000 экземпляраў кніг выпускала штогод Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі. Акадэмія Навук БССР стала ў апошні час уладальніцай самых рэдкіх гістарычных кніг і дакументаў, як, напрыклад, судовая справа героя беларускага народа Кастуся Каліноўскага з яго мужнымі наказаннямі. Бібліятэка Акадэміі Навук захоўвала ў рукапісах кнігу ўспамінаў этнографа Адама Багдановіча аб сваім сыну, вялікім беларускім паэту Максіму Багдановічу.

Немцы наглуміліся над нашым культурным багаццем. Яны кінулі ў звалку кнігі тых пісьменнікаў і паэтаў, якімі па праву ганарыўся беларускі народ.

На Кастрычніцкай вуліцы, дзе немцы спалілі дом нашага вялікага Янкі Купалы, размяшчалася старэйшая ў Беларусі бібліятэка імені А. С. Пушкіна. На паліцах яе не засталося ніводнай кнігі. У Доме Урада кнігі з бібліятэкі імені А. М. Горкага былі звалены ў сутарэнне, дзе ў немцаў знаходзілася жывёла. Ніводнай кнігі не захавалася ў бібліятэцы Акадэміі Навук БССР. Поўны пагром учынілі гітлераўскія вандалы ў Дзяржаўнай бібліятэцы імені Леніна. З двух мільёнаў кніг, набытых бібліятэкай, наўрад ці захавалася да дня вызвалення Мінска 300.000, але і тое, што захавалася, па свайму значэнню ўступае кнігам раскрадзеным і знішчаным.

Совецкі народ не можа жыць без кнігі. Нам кніга «будаваць і жыць дапамагае» і, натуральна, што аднаўленне Мінска, як і другіх гарадоў Беларусі, пачалося з аднаўлення бібліятэк. Не гледзячы на тое, што Мінск пазбавіўся 80 процантаў сваіх будынкаў, бібліятэкі адразу-ж, яшчэ ў ліпені мінулага года, атрымалі свае памяшканні. Бібліятэкары пачалі шукаць уцалелыя кнігі, збіраць кнігі сярод чытачоў. На дапамогу Беларусі прышлі брацкія саюзныя рэспублікі, буйныя культурныя цэнтры нашай Радзімы. Ці-ж не паказальна, што ў тых эшалонах, дзе ішло для рэспублікі фабрычна-заводскае абсталяванне, былі і вагоны з кнігамі. Вагон кніг атрымала бібліятэка Мінскага Дома Чырвонай Арміі з Свярдлоўска, некалькі вагонаў з кнігамі прыбылі ў Віцебскую абласную бібліятэку, 300.000 кніг атрымлівае ў падарунак з Масквы і Ленінграда бібліятэка Акадэміі Навук БССР. Нядаўна ў гэту бібліятэку з 4 Украінскага фронта прыбыло 6 вагонаў з кнігамі, вывезенымі ў свой час немцамі з Беларусі. Нашы доблесныя франтавікі знайшлі час і магчымасць заняцца пошукамі кніг, якія належаць Беларусі.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна з кожным днём ліквідуе сляды нямецкай акупацыі, залечвае раны, што нанеслі гітлераўцы культуры нашага народа. Зноў прыняў свой даваенны выгляд будынак бібліятэкі імені Ул. І. Леніна, зашклёны вокны, расстаўлены на сваіх месцах сталы, поўняцца паліцы кнігасховішча. Бібліятэка зноў атрымлівае з усіх канцоў Совецкага Саюза тое, што выдаецца ў нашай Радзіме. Першай вялікай выстаўкай у бібліятэцы была выстаўка, прысвечаная кнізе Айчыннай вайны.

Хутка дасягне свайго даваеннага стану ўрадавая бібліятэка імені Горкага, якая своечасова і ўдала адгукаецца на ўсе тэмы дня.

Адноўлены ўсе абласныя бібліятэкі нашай рэспублікі. Няма ніводнага Дома Соцыялістычнай Культуры, ніводнай хаты-чытальні без кніжнага фонда. Несвіжу прыслалі ў падарунак кнігі тамбоўцы, Радашковічы атрымалі бібліятэку з Ленінграда.

Кніга зноў становіцца здабыткам народа. Радасна і ўцешна, што наша Дзяржаўнае Выдавецтва БССР зноў разгарнула выпуск кніг на вызваленай зямлі, зноў творы беларускіх пісьменнікаў сталі шырока распаўсюджвацца ў масах. Зноў загаварылі з народам праз кнігі М. Лынькоў, А. Куляшоў, П. Броўка, М. Танк, П. Глебка, К. Крапіва.

Кніга — сябра беларускага народа, паказальнік яго высокай культуры, яго зброя ў барацьбе з фашысцкім цемрашальствам.

Беларускаму чытачу зноў вернуты яго мільёны кніг і гэта немалаважны поспех аднаўлення нашай роднай совецкай культуры.

Е. САДОЎСКІ.

Максім Танк

ГАЛІНКА І ВЕРАБЕЙ

— Галінка-вярбінка, —
прасіў верабей, —
Мо' пакалыхала-б маіх ты дзяцей.
Галінка не хоча дзяцей калыхаць.

— Ідзеце, казулі, галінку ламаць!
Казулі не хочуць.
— Ідзеце, ваўкі,
Лавіці, караці казуляў такіх,

Якія не хочуць галінку ламаць,
Якая не хоча дзяцей калыхаць!
Ваўкі не схацелі.
— Прыходзьце, стральцы,

Каб непаслухмяных ваўкоў правучыць,
Якія не хочуць казуляў караць,
Якія не хочуць галінку ламаць,
Якая не хоча дзяцей калыхаць!

Пайшлі паляўнічыя ў лес на ваўкоў:
Спалохана зверы пабеглі з дуброў,
Пабеглі казуляў лавіць і караць,
Казулі пабеглі галінку ламаць.

Галінка-ж-вярбінка са страху хутчэй
Давай калыхаць вераб'іных дзяцей.
З тых дзён, без спачынку, каб кожны быў рад,
Калыша галінка усіх птушанят.

—<>—

Алесь Астапенка

АПОШНІ САЛЮТ

Апошні гром салюта навальніцай
Праплыў над старажытнаю сталіцай,
Так ярка ў цемры палымнеў агонь,
Што з Мінска ўбачыў водбліскі яго.

Стаю ля дома роднага ў завулку,
Не чую ў горадзе раскатаў гулкіх,
Ракеты не ўзлятаюць, а наўкол—
І неба светлае і светлы дол.

І светла на душы юнацкай ад
салютаў:
Няма на свеце цемрашалаў лютых;
Ніколі не было так у жыцці,
Каб цёмнай ноччу яркі дзень свяціў!

З Масквы далёкай—сонечнага краю—
Пялёсткі вогненныя адлятаюць,
Як зоры падаюць у Волгу і Дунай,
І наш наднёманскі асветлен край.

Гляджу на ўсход—там сонца перамогі.
Праз рэкі і гаі, праз пушчы і дарогі
Відаць мне ўся Вялікая Зямля
І зоры рубіновыя Крэмля.

А сцены сівыя, што дань вякоў
сабралі,
Зусім празрыстымі ад шчасця сталі...
Сам Сталін наглядаў, як за вакном
Салюта коціцца апошні гром.

«Партрэт партызанкі».
Работа мастака З. Паўлоўскага.

ПРА ЗБОРНІК А. АСТРЭЙКІ

Тры з лішнім гады зямля нашай бацькаўшчыны была ў палоне. Нямецкія барбары, паласуючы яе жывое цела, тапталі жалезным ботам нашы шырокія палеткі, забруджвалі чыстыя крыніцы, знішчалі нашых людзей. Трагічны лёс роднага краю болем адгукаўся ў сэрцы яго сыноў і дочак і яны—мужныя і бясстрашныя людзі — ішлі ў бой супроць ненавіснай нямецкай набрыдзі.

Трагічны лёс паланёнай Беларусі падзяляў кожны, у кім білася гарачае сэрца патрыёта. І кожны на сваім пасту рабіў усё, што ад яго залежала, у імя таго, каб бачыць сваю Радзіму зноў свабоднай і шчаслівай.

Воін каваў перамогу крывёю і зброяй, калгаснік — хлебам, паэт — палымяным, натхнёным словам. І слова станавілася поплеч са штыком.

Такі невялікі ўступ напрашваецца да кніжкі беларускага паэта Анатоля Астрэйкі «Крэмлёўскія зоры».

Вершы, сабраныя ў зборніку «Крэмлёўскія зоры» — гэта песні пра Радзіму, пра яе лёс, пра яе людзей і барацьбу. Усе яны прасякнуты пачуццём замілавання да роднага краю, нясцерпнай тугой па ім, калі паэт быў ад яго далёка, і верай у тое, што ноч нямецкай няволі міне і родны край зноў будзе свабодны.

Усё было мне міла тут:
Над Нёманам зялёны кут,
Палі шырокія, узгоркі,
І смоль сасны, і ў небе зоркі,
І пах асіны гаркаваты,
Сады зялёныя ля хаты,
І гучны перазвон крыніц,
І сполах вечарам зарніц...

Успамінае паэт з чуллівым замілаваннем.

Пра Радзіму сваю, пра Беларусь паэт гаворыць і ў другіх вершах і кожны раз знаходзіць для яе цёплыя, натхнёныя словы:

Ад усіх наскрозь адменная,
Я люблю цябе адну,
І цябе ніякім ценем я,
Ні дакорам не крану.

Гэтыя пачуцці паэта — любоў да бацькаўшчыны, да роднай зямлі яшчэ больш узмацняліся тым фактам, што паэту даводзілася жыць далёка ад Беларусі і бачыць яе толькі ў марах і сне. Паэтычнае ўяўленне А. Астрэйкі аб тым, што рабілася на Беларускай зямлі, часова захопленай немцамі, стварала беспамылковыя карціны. Паэт добра ведаў свой народ, ведаў, што не скорыцца ён ворагу, не стане на калені. З Беларусі ішлі радасныя весткі пра нарастаючы ўсенародны партызанскі рух. І гэтыя факты — факты волічнай барацьбы народа — рабіліся тэмамі вершаў А. Астрэйкі.

Прага помсты ворагу вядзе паэта ў партызанскі край. І тут, у партызанскім Палессі, А. Астрэйка піша вершы пра тое, што бачыць уласнымі вачыма. Слуцкая падпольная друкарня друкуе яго зборнічак вершаў «Слуцкі пояс», якія, да рэчы, увайшлі і ў рэцэнзуемы зборнік. Вершы, напісаныя ў партызанскім краі, хоць літаратурна яны часта і недапрацаваны, выгадна вылучаюцца сярод другіх праўдзівасцю паэтычных пачуццяў, многімі трапнымі дэталямі, якія можна было заўважыць толькі ўласнымі вачыма.

А. Астрэйка назваў свой зборнік «Крэмлёўскімі зорамі». Чытаючы многія вершы, адчуваеш за імі святло крэмлёўскіх зорак, якое саграваала сэрцы совецкіх людзей і напаўняла іх верай у пераможны зыход цяжкай і крывепралітнай барацьбы. Крэмлёўскім зорам паэт прысвячае і непасрэдныя радкі:

Праз чорныя хмары, праз копаць
і дымы,
Праз дрот франтавы, праз туман
і прымус
На зоры крэмлёўскія слаўнай Радзімы
З надзеяй і верай глядзіць беларус.
І далей:

Не словам — жыццём маладым і
прыгожым
Клянемся мы Сталінскім зорам
Крэмля,
Што будзе магілай чужынцам ва-
рожым
Майго беларускага краю зямля.

І зямля нашага роднага краю стала магілай чужынцам, якія наважваліся пакарыць яе.

Зборнік «Крэмлёўскія зоры» сведчыць пра бясспрэчны рост маладога аўтара, пра тое, што А. Астрэйка настойліва шукае сваё паэтычнае «я» і знаходзіць верную дарогу. У зборніку ёсць многа вершаў, зробленых шчыра, з густам. Да ліку такіх вершаў можна аднесці «Беларусь» — верш пачуццёвы, сардэчны, хоць ён і мае ў сабе некаторыя перайманні. Арыгінальны верш «Вятрак» падкупляе, назіральнасцю аўтара, надзвычай трапна схопленымі дэталямі, адсутнасцю трафарэта і штампа. Гэта-ж самае можна сказаць і пра многія другія вершы.

Аднак не ўсе вершы ў зборніку знаходзяцца на адным узроўні. Прыемнае ўражанне ад многіх добрых вершаў пеуецца прысутнасцю ў зборніку і такіх вершаў, якія зроблены без пачуцця, з халодным сэрцам, маюць мноства прыкрых сэнсавых і стылістычных хібаў.

Прывядзем некаторыя з іх.

Верш «Край благаслаўляе» пачынаецца радкамі, звернутымі да совецкага воіна, які сімвалізуе ў вершы ўсю Чырвоную Армію: «На ўсход мы вочы праглядзелі, цябе чакалі цэлы год». Пад вершам-жа дата: «1943 г. Масква». Незразумела: чаму ў 1943 годзе аўтар праглядзеў вочы з Масквы на ўсход, калі вораг пад Масквой быў разгромлен яшчэ ў 1941 годзе.

У вершы «Радзіма» ёсць такія недарэчныя словы: помста «паўстала з сялянскіх застрэш». Незразумела таксама, што азначае фраза «і рабамі ў фашыстаў не кіну» (можна кідаць каменні) і якія гэта бываюць «шыбы на вокнах».

У вершы «Партызанскі медаль» сустракаюцца такія радкі:

«Хто сэрцам пакляўся гарачым
Біць лютага ворага век,—
Урадам, народам адзначан
За мужнасць такі чалавек».

А нам, грэшнай справай, здавалася, што адной клятвы мала, каб быць адзначаным; не за клятвы-ж даюць узнагароды. І чаму «біць лютага ворага век». Яго-ж даканалі ў больш кароткі тэрмін...

Канец верша гучыць не менш дзіўна:
«Тым слава, хто б'ецца аддана,
Хто ўсцеле чужынцамі шлях,
Хто носіць медаль партызана
За подвігі ў жорсткіх баях».

Чаму зноў слава тым, хто «усцеле», а не ўсцілае, або ўслаў ужо шлях чужынцамі. І чаму слава не самому партызану, а таму, хто «носіць медаль партызана»?

Часта А. Астрэйка недакладны ў сваіх фармуліроўках. У вершы «Надыйдзе дзень» ён надакучліва сцвярджае, што «нас ад Масквы адрэзала вайна». Кожнаму ясна, што гэта проста супроцьлегла праўдзе.

Не ўсё можа стаць тэмай паэтычнага твору і не ўсе адчуванні паэта заслугоўваюць таго, каб аб іх ведаў чытач. Гэтую думку нам падказаў верш А. Астрэйкі «Зімовы дом», з якога мы даведваемся, што аўтар, блукаючы ў завіруху па партызанскім лагеры, збіўся з дарогі і «ўрэшце паклікаў патруля, каб той правёў яго да хаты».

«У будзе спакойней мне...»
— заключае аўтар. Можа быць аўтару і сапраўды было «спакойней у будзе», але навошта аб гэтым ведаць чытачу.

Да такога-ж разраду можна аднесці і верш «Тытунь».

А. Астрэйка не зусім дбайна працуе над вобразамі, над мовай. У яго можна знайсці такія выразы, як «болей не пытай», «каратаюць дні», «статкі лозаў ніцых», «далі прытул», «ваджуся доўга над радкамі», «і не даюць мне трохі ўмовы», «на той нядзелі», «вестачку сваю пішыце», «после» і многае іншае.

У адным з вершаў А. Астрэйка прызнаецца, што ён не аб усім напісаў, што бачыў, і не зусім так, як гэта належала-б. Слушнае прызнанне. Пры большым стараанні і патрабавальнасці да сябе А. Астрэйка мог-бы больш крытычна аднесціся да многіх вершаў свайго зборніка і значна дапрацаваць іх. Да месца напомніць тут даўно вядомую ісціну, што талент — гэта ў значнай ступені стараннасць.

Зборнік быў-бы больш поўнацэнным, калі-б і выдавецтва, якое выдала яго, папрацавала-б з аўтарам.

В. БЯРОЗКА.

Аб Нацыянальным Пантэоне Беларусі

...дзень прыйдзе
і з урнай Купалы
Вернемся мы на радзіму сваю.
(Максім Танк)

Дзе-б мы ні былі ў гэтыя гады, поўныя пакут і цяжкага змагання — ці на пярэдняй лініі фронта, ці ў партызанскіх лясах—кожны з нас у самай глыбіні сваёй душы песціў надзею: Эх! дажыць-бы да дня перамогі!

У гэту сапраўдную вясну чалавецтва — 1945 г. — яшчэ больш цяжка і балюча адчуваем мы адсутнасць сярод нас тых, чыі сэрцы да астатку згарэлі ад вялікай, бязмежнай журбы па роднай краіне. Дажыць-бы ім, каб нацешыцца найвялікшым цудам: на твары, на якім не зарубцаваліся яшчэ глыбокія раны, шырока разлілася радасць пераможцы!

...Каля помніка Леніну на плошчы Дома Ураду чалавек у летнім паліто і капялюшы, з кійком у руцэ, высока ўзняў галаву ўгару і глядзіць — разглядае манумент. Няўжо-ж гэта ён...

— Дзень добры, дзядзька Купала!.. Не, не ён... выбачайце...

Ці-ж гэта казка?! Няўжо менш казачна тое, што на плящы, які так нядаўна быў акружаны калючым дротам і кулямётнымі гнёздамі, мог паўстаць манумент Леніна?

Аднак, на жаль, нам даводзіцца думаць аб урне народнага паэта, аб тым, каб на радзіму прывезці тое, што засталося ад фізічнага Купалы.

У гэтыя вясновыя дні мы часта аб ім будзем думаць. У канцы мая спаўняецца 40 год з пачатку творчасці Купалы. У чэрвені — 3-годдзе з дня смерці народнага паэта. Не аб нашым абавязку — аб самай пільнай нашай патрэбе няхай будзе сказана: урна Янкі Купалы павінна быць на беларускай зямлі. І будзе гэта ўрна на месцы, дзе паўстане Нацыянальны Пантэон Беларусі, дзе будучыя пакаленні ўспомняць

...як лепшага сына,
Аддаўшага дар песняра
Народу і роднай краіне,
Дар яркі, як золак-зара.
(Якуб Колас)

* * *

Не, гэта не лятуценні, а справа сённешняга дня!

Паедзем у сонечны Крым, паклонімся магіле Максіма Багдановіча і скажам:

— Мы вярнулі спакой зямлі, растаптанай ботам тэўтонца-рабаўніка. Праз граніцу так горача любімай табою краіны не пройдзе больш ніколі ні адзін вылюдак-чужынец. Вярніся дамоў, любы наш пясняр, і сон твой вечны будзе непарушны.

...Будзе месца ў Пантэоне і для цябе, ушякач з местачковага нешыбота ў шырокі свет мараў, песняў і змагання. Тваё сэрца не вытрымала вялікай напружанасці болю за лёс палаўнёнага народа. Сёння, на ўрачыстасці пераможнай радзімы ты павінен быць сярод нас. Змітрок Бядуля спачываць будзе ў беларускай зямлі.

* * *

Яны тут, каля нас.

Бывала так: з партызанскага атрада Героя Совецкага Саюза тав. Пакроўскага прыходзіў сувязны. Яму трэба ўзброеных людзей вывесці з горада ў лес. Асцярожна. Вораг не павінен даведацца аб месцы збору.

— Спаткаемся каля Паўлюка!

На вайсковых могілках у поўзмроку, каля помніка без надпісу, спаткаліся людзі, каб вярнуцца ў Мінск не інакш, як з поўнай перамогай. З каменнага помніка глядзеў на іх добры, амаль дзіцячы твар паэта Паўлюка Труса, быццам благаслаўляючы іх на баявы партызанскі подвіг.

Надпісу на помніку Паўлюка Труса да сённешняга дня няма. Трэба помнік скончыць, каб ён адпавядаў свайму месцу ў Нацыянальным Пантэоне.

Бывала і гэтак: ідзе жанчына і, хаваючы быццам недазволенае, нясе некалькі жывых кветак. Прыдзе на гэтыя самыя вайсковыя могілкі, недалёка ад магілы Паўлюка Труса, пакладзе кветкі, падраўнуе крыху зямлю навокал і ціха, асцярожна адыйдзе.

Марыя Канстанцінаўна Хайноўская наведваннем магілы Эдуарда Самуйлёнка ў часы нямецкай няволі як-бы вяртала сабе кавалак шчасця тых дзён, калі яна, супрацоўніца Саюза Совецкіх пісьменнікаў Беларусі, была сведкай буйнага росквіту талента гэтага выдатнага пісьменніка.

Над магілай Эдуарда Самуйлёнка няма яшчэ помніка. Ён павінен быць збудаваны.

Скромная магіла. Тут пахаваны адзін з аснавальнікаў Беларускага Драматычнага тэатра — Уладзімер Крыловіч. Мы памятаем яго сцэнічны стыль, мы не забудзем яго Кастуся Каліноўскага, вобраз, які ўвасабляе гераізм народа. Ён адчуваў гэты гераізм ўсёй сваёй багатай душой і абуджаў у нас гордасць за вялікія справы народа.

З удзячнасцю спынімся каля яго магілы, якой месца сярод магіл заслужаных творцаў нашай культуры.

* * *

...Яго мы адчуваем яшчэ сёння жывым сярод нас, хоць самі яго хавалі на тых-жа вайсковых могілках. Кузьма Чорны — жыхар Пантэона! Гэта гучыць неверагодна нават сёння, праз паўгода пасля яго смерці. Аднак гэта так!

Над магілай Кузьмы Чорнага вырасла першая трава.

* * *

Краіна цяпер уваскрасае. Вялікая адбудова, якая пачалася ў дні, спавітыя яшчэ дымам папялішчаў, мірная творчая праца становіцца галоўным зместам нашага жыцця.

Няхай у плане адбудовы краіны знойдзецца месца і для стварэння Нацыянальнага Пантэона Беларусі.

Доўг, абавязак і патрэба гэтага ад нас вымагаюць!

Г. СМОЛЯР.

ТЭАТР ЛЯЛЕК БССР

Дзяржаўны тэатр лялек БССР абслугоўвае дзяцей непасрэдна ў школах. Стала гэты тэатр знаходзіцца ў Гомелі, але ён пабываў ужо і ў Мінску, а таксама гастраліруе па абласных і раённых гарадах рэспублікі.

У яго рэпертуары рознастайныя і цікавыя пастаноўкі — «Цудоўны кошык» С. Маршака, «Каштанка» Спяранскага (інсцэніроўка апавядання А. П. Чэхава), «Вялікі Іван» Абразцова і Прэабражэнскага і «Па шчучаму вяленню» Е. Тарахоўскай. Усе гэтыя спектаклі пастаўлены мастацкім кіраўніком тэатра М. Бабушкіным, дэкарацыі і лялькі зроблены па эскізах мастака Б. Звенігарадскага. У паказах заняты артысты С. Дзям'янава, Н. Правіст, А. Какора. Калектыў налічвае 17 работнікаў. Спектаклі глядзелі каля 100 тысяч дзяцей.

Цяпер тэатр прыступае да працы над арыгінальнай беларускай сцэнічнай казкай В. Вольскага «Дзед і жораў».

Адбудаваны дамы культуры

У Баранавіцкай абласці адбудаваны 16 дамоў культуры, якія разгарнулі шырокую культурна-асветную працу сярод насельніцтва. У гэтых Дамах сістэматычна наладжваюцца лекцыі на палітычныя і навукова-асветныя тэмы, працуюць гурткі самадзейнасці. Амаль усе Дамы культуры паслалі ў вёскі на час сяўбы бібліятэкі-перасоўкі.

НАРАДА КАМПАЗІТАРАЎ У РЭДАКЦЫІ НАШАЙ ГАЗЕТЫ

16-га мая ў рэдакцыі «Літаратура і Мастацтва» адбылася нарада кампазітараў і супрацоўнікаў газеты з поваду абмеркавання пытанняў музычнай крытыкі.

У абмеркаванні прынялі ўдзел кампазітары — Я. Цікоцкі, М. Аладаў, В. Яфімаў, П. Падкавыраў, музыказнаўцы — Б. Смольскі і М. Шыфрын.

АТ 29792.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Рэволюцыйная вул № 13.

Рэдкалегія: Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ, А. БАГАТЫРОЎ, Г. ГЛЕБАЎ, Я. КОЛАС, А. КУЛЯШОЎ (адказны рэдактар), А. КУЧАР, П. ПЕСТРАК.

Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэволюцыйная, 12.